153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1.12.36 Вып.2.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 88 (5462)
ПЯТНІЦА
17
КРАСАВІКА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Забараніць пасеў непратручаным насеннем пшаніцы, аўса і проса. Пратручванне насення рабіць абавязкова пад кіраўніцтвам аграномаў, з абавязковым складаннем актаў аб пратручванні за подпісамі старшыні калгаса і агранома.

(З пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб дзяржаўным плане веснавой сяўбы)

Шырэй спаборніцтва на сплаве

Лепшыя стаханаўцы беларускага сплаву — **Шэўчык, Туфар, Кабыльнец, Давідан** і інш. — звярнуліся з пісьмом да сплаўшчыкаў Совецкага Саюза.

«1936 год, — пісалі яны ў гэтым пісьме — стаханаўскі год, і сплаў 1936 года трэба арабіць стаханаўскім сплавам».

Скончыць сплаў 1936 года на месяц раней устаноўленых планам тэрмінаў, выканаць красавіцкі план да 20 красавіка — вось абавязацельствы, якія ўзялі на сябе сплаўшчыкі БССР.

Гэта пісьмо ўсе сплаўшчыкі нашай вялікай совецкай краіны сустрэлі з велізарнейшым уздымам. Яно ўзняло хвалю спаборніцтва паміж сплаўнымі ўчасткамі, басейнамі і асобнымі сплаўшчыкамі на лепшае і хутчэйшае правядзенне сплаву, на заваяванне пяршынства.

Ход сплаву па БССР паказвае, што беларускія сплаўшчыкі, ініцыятары ўсесаюзнага спаборніцтва, цвёрда выконваюць данае імі слова.

Знатны сплаўшчык БССР і Совецкага Саюза — адзін з арганізатараў спаборніцтва Шэўчык Арцём (Мазырскі сплаўны ўчастак) са сваёй брыгадай ужо выканаў план сплаву і выехаў на дапамогу брыгадзе Шэўкі Алеся, з якім ён спаборнічае. Узоры сапраўды бальшэвіцкай работы паказвае брыгада тав. Кабыльянца Свіслацкага ўчастка. Норму вязкі брыгада выконвае на 250 проц. Замест 10 кубаметраў па плану стаханаўцы гэтай брыгады вяжуць у дзень па 25 кубаметраў лесу. На сплаў 90 кубаметраў лесу з мястэчка Свіслач у Бабруйск раней патрэбна было 4 дні, а брыгада Кабыльянца сплаўляе пяпер на гэтым-жа ўчастку за 3 дні 150 кубаметраў.

Гэтыя факты паказваюць, што рабочыя сплаву — гэтага важнейшага ўчастка народнай гаспадаркі — авалодваюць стаханоўскімі метадамі работы, што і тут хутка растуць выдатныя кадры стаханаўцаў, любячых сваю справу, людзей, якія выяўляюць неабмежаваныя магчымасці, разбіваюць старыя звычаі і традыцыі. Гэта стварае ўсе ўмовы для таго, каб абавязацельствы, узятыя ў пісьме, былі не толькі выкананы, але і намнога перавыкананы, каб і ў гэтым годзе пяршынства па сплаву замацаваць за БССР.

Але неабходна папярэдзіць супроць галавакружэнняў ад поспехаў, якія праяўляюцца ўжо сярод паасобных кіруючых работнікаў сплаву. Выканаць план на месяц раней вызначанага планам тэрміну можна толькі тады, калі на пяпершнім узроўні работы лепшых стаханаўцаў будуць прапаваць **УСЕ** сплаўшчыкі, **УСЕ** басейны. Між тым, мы маем рад фактаў, калі за спіной лепшых сплаўных участкаў хаваюцца адстаючыя, не выконваючыя сваіх планаў людзі.

Поспех сплаўных работ вельмі значна залежыць ад леспрамгасаў, якія абавязаны своечасова падвезці лес да прыстаней. З гэтага боку ёсць сур'ёзная небяспека.

З мазырскай сплаўной канторы паведамляюць, што тэмпы падвозкі лесу да прыстаней ствараюць небяспеку, што, прыкладна, з другой дэкады мая ўжо не будзе чаго сплаўляць. Аб гэтым-жа гаворыць паведамленні з барысаўскага сплаўнога ўчастка. Такая безадказная работа некаторых леспрамгасаў можа сарваць, знішчыць стаханаўскую работу сплаўшчыкаў. Таму неабходна работнікам сплаву леспрамгасаў, мясповым партыйным і совецкім арганізацыям неадкладна прыняць усе меры для таго, каб узмацніць падвоз лесу да прыстаней, каб забяспечыць нармальны ход сплаву. **Гэта адна з важнейшых задач дня.**

Забеспячэнне сплаўшчыкаў прадуктамі харчавання, адзеннем, культурнае абслугоўванне таксама надзвычай дрэннае. Стаханаўскі рух на сплаве ідзе міма ОРС'аў, якія абавязаны забяспечваць сплаўшчыкаў усім неабходным. Бюракраты многіх ОРС'аў [illegible] становяцца ўпоперак дарогі стаханаўскаму руху. Хіба гора-кіраўнікі з Любаньскага ОРС'а, якія прывезлі [illegible] сплаўшчыкаў гнілыя селядцы, ці работнікі Жыткавіцкага ОРС'а, дзе сплаўшчык не можа купіць ні адзення, ні бялізны, не затрымліваюць паспяховае правядзенне сплаву?

А калі ўзяць культурнае абслугоўванне сплаўшчыкаў, то тут справа яшчэ горш пастаўлена. У нас часта забываюць, што наш сплаўшчык ужо не той, які быў калісьці. Наш сплаўшчык хоча рэгулярна чытаць газету, кнігу, чыста адзявацца, гутарыць на розныя пікавыя тэмы. Мы абавязаны задавольваць яго запатрабаванні, праяўляць клопаты аб ім.

Начальнікі сплаўных участкаў, мясповыя партыйныя, профсаюзныя і совецкія арганізацыі абавязаны сачыць не толькі за зводкамі выканання плана, але ўмець за лічбамі бачыць жывых людзей, якія вырашаюць поспех усёй работы, праяўляць выключную ўвагу і клопаты аб гэтых людзях.

Якасці работы на сплаве павінна быць аддана асаблівая ўвага. Гутарка ідзе перш за ўсё аб барацьбе супроць страт, супроць таплення і ўплывання драўніны, што ў мінулыя гады прыносіла велізарнейшыя страты нашай краіне. Работа без страт з'яўляецца важнейшым паказальнікам сапраўды стаханаўскай работы кожнага сплаўшчыка, брыгады, участка.

Шырэй спаборніцтва паміж сплаўшчыкамі, вязчыкамі, сплотчыкамі, дубавікамі, лоцманамі. Мацней ударым па сабатажніках стаханаўскага руху на сплаве — у гэтым зарука таго, што пастаўленая задача — закончыць сплаў за месяц да планавага тэрміну — будзе не толькі выканана, але і перавыканана.

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ГРАМАТАМІ СНК БССР І КАШТОЎНЫМІ ПАДАРУНКАМІ ЛЕПШЫХ ТАРФЯНІКАЎ СІСТЭМЫ БЕЛТОРФПРАМСАЮЗА

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. За добрыя паказальнікі работы па выкананню плана торфаздабычы па сістэме Белторфпрамсаюза ў сезоне 1935 г., узнагароджаць граматамі СНК БССР і каштоўнымі падарункамі наступных таварышоў:

1) Рагаву, Марыю Ефімаўну, калгасніцу калгаса «Чырвоны араты», Церахоўскага раёна, працуючую ў арцелі імя Вароўскага, — граматай і патэфонам.

2) Семашка, Фёдара Фёдаравіча, калгасніка калгаса «Камбайн», Буцкага раёна, працуючага ў арцелі «Энергія», — граматай і гадзіннікам.

3) Мельнікава, Егора Міхайлавіча, калгасніка калгаса імя Варашылава, Церахоўскага раёна, працуючага ў арцелі «Перамога», — граматай і гадзіннікам.

4) Дзічкоўскую Гэлю Антонаўну, калгасніцу калгаса «Пражэктар», Копыльскага раёна, працуючую ў арцелі «Чырвоны тарфянік», — граматай і патэфонам.

5) Шульмана, Майсея Зісілева, старшыню арцелі «Чырвоны тарфянік», Копыльскага раёна,—граматай і патэфонам.

6) Грамовіча, Владзіміра Рамановіча, дзесятніка торфарцелі «Ударнік», Менскага раёна, — граматай і патэфонам.

7) Бурага, Антона Александравіча, торфмайстра арцелі імя 16 чырвоных партызан, Смілавіцкага раёна, — граматай і патэфонам.

8) Бажанава Васілія Александравіча, старшыню арцелі імя 16 чырвоных партызан, Смілавіцкага раёна, — граматай і паляўнічым аружжам.

9) Юдэлевіча, Лейбу Янкелевіча, старшыню арцелі «Энергія», Дзяржынскага раёна, — граматай і патэфонам.

10) Марцінкевіча, Браніслава Станіслаўвіча, торфмайстэра торфарцелі імя Варавы, Менскага раёна, — граматай і патэфонам.

2. Совет Народных Камісараў БССР адзначае, што дзякуючы ўмелай арганізатарскай рабоце старшыні Белторфпрамсаюза тав. Славіна сістэма тарфяной кааперацыі ў 1935 годзе дабілася ў сваёй рабоце значных поспехаў.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
Н. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік спраў Совета Народных Камісараў БССР
І. ЛУК'ЯНЧЫК.

АБ УТВАРЭННІ ЎРАДАВАГА КАМІТЭТА ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЮ ЮБІЛЕЮ 15-ГОД ДЗЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР.

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

У сувязі з надыходзячым юбілеем 15-годдзя Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, утварыць для арганізацыі і правядзення юбілею ўрадавую камісію ў наступным складзе: тт. Дзьякаў А. І. (старшыня), Сурта І. З., Стэрнін Н. К., Гершон І. Х., Чыжова М. Е., Варончанка А., Вальфсон С. Я., Нікольскі Н. Н. (акадэмік), Шчарбакоў В. Г., Ермоленка Н. Ф. (прафесар), Башкевіч В. І., Кучынскі А. С.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

15 красавіка 1936 г.
г. Менск.

Вялікаму правадыру народаў таварышу СТАЛІНУ

Дарагі і любімы Іосіф Вісарыёнавіч!

Табе, нашаму правадыру і настаўніку, першаму машыністу лакаматыва рэволюцыі, табе, з чыім імем непарыўна звязаны росквіт і магутнасць сацыялізма, кіпучая радасць нашага жыцця, наша шчасце, табе, вялікаму **Сталіну**, пасылаем мы, чыгуначнікі, сваё першае слова палкага прывітання і найглыбейшай адданасці.

Уся краіна адзначае перамогу, атрыманую чыгуначным транспартам, кіруемым тваім лепшым саратнікам Лазарам Майсеевічам Кагановічам. Мы перамаглі таму, што кожны дзень адчувалі тваё клопаты аб транспарце і яго людзях, мы перамаглі таму, што нас натхнілі і згуртавалі ў баявы калектыў тваё сталінскія заданні, сталінская пахвала, сталінскія клопаты аб уздыме і росквіце транспарту.

Мы горды і шчаслівы сваёй перамогай, горды тым, што з'яўляемся сталінскімі байцамі за ператварэнне чыгунак краіны Совецкаў ва ўзорны сацыялістычны транспарт.

Дарагі наш правадыр і настаўнік! У баях з ворагамі і прадзельшчыкамі, у баях за перапрацоўку людзей выканалі мы першую частку твайго гістарычнага наказу — грузіць не менш 80.000 вагонаў у суткі.

Але мы ведаем, што яшчэ не выканана, але павінна быць выканана ва што-б там ні стала другая частка твайго наказу — працаваць з чоткасцю механізма гадзінніка. Аб гэтым нядаўна пісалі табе ў сваім пісьме паўтара мільёна чыгуначнікаў.

Даем тэбе, наш правадыр і настаўнік, наш дарагі і любімы Іосіф Вісарыёнавіч, цвёрдае слова чыгуначнікаў — большэвікоў партыйных і непартыйных:

— Мы будзем дабівацца і даб'ёмся, каб нашы графікі былі беспамылковымі і выконваліся няўхільна, як жалезны закон, каб нашы лакаматывы і вагоны хадзілі па чыгуначных шляхах Совецкай краіны без спазнення.

— Мы будзем дабівацца і даб'ёмся ліквідацыі крушэнняў і аварый, пагрузкі ста тысяч вагонаў у суткі, культурнага абслугоўвання пасажыраў, каб транспарт вялікай сацыялістычнай чыгуначнай дзяржавы быў годным эпохі **Сталіна.**

Смела глядзіць у будучае шчаслівы совецкі народ. Смела і ўпэўнена думаем аб будучым транспарту і яго работнікаў, мы, чыгуначнікі. Мы непераможны, бо нашу краіну вядзеш наперад ты, вялікі **Сталін**, бо лакаматывам рэволюцыі кіруеш ты, вялікі **Сталін**, бо армію чыгуначнікаў узначальвае твой лепшы баявы саратнік, сапраўдны ленінец-сталінец Лазар Майсеевіч **Кагановіч.**

Няхай жыве правадыр народаў, родны вялікі Сталін!

Сход работнікаў чыгуначнага транспарту ў Крэмлі

15 красавіка ў Вялікай зале Крэмлёўскага палаца адбыўся абъяднаны сход праходзячых у сучасны момант у Маскве шасці галінных нарад работнікаў чыгуначнага транспарту — паравознікаў, эксплаатацыйнікаў, вагонніка ў, пуцейцаў, сувязістаў і заводаў транспарту.

На гэтых галінных нарадах, якія прайшлі з выключнай актыўнасцю і дзелавітасцю і ў рабоце якіх прымаў непасрадны ўдзел народны камісар шляхоў зносін тав. Л. М. **Каганові ч**, былі абмеркаваны важнейшыя пытанні работы транспарту. Усяго ў нарадах прымае ўдзел больш 3.500 гаспадарчых кіраўнікоў, палітработнікаў, інжынераў, тэхнікаў і стаханоўцаў-крывароносаўцаў транспарту.

Многія дэлегаты нарад прапаноўвалі для яшчэ большага згуртавання, яшчэ большай адданасці ў рабоце ўсіх служб і ўсіх работнікаў чыгуначнага транспарту заключыць дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва паміж рашаючымі галінамі транспарту. Гэта прапанова была аднадушна падтрымана ўсімі ўдзельнікамі нарад. Абмеркаванню гэтай прапановы і было прысвечана ўчарашняе аб'яднанае пасяджэнне ўсіх удзельнікаў нарад у Вялікім Крэмлёўскім палацы.

— Вялікая зала Крэмлёўскага палаца перапоўнена работнікамі транспарту. Пад гром воплескаў, пад гарачыя авацыі ўсіх прысутных з'яўляюцца ў прэзідыуме таварышы **Л. М. Каганові ч, М. І. Калінін, А. І. Мікаян, А. А. Андрэеў, А. А. Жданаў, В. Я. Чубар, Я. Э. Рудзутак, В. І. Межлаук, Н. К. Анціпаў.**

Магутнае радаснае «ўра» нясецца з розных канцоў велізарнай залы. Раздаюцца воклічы: «Няхай жыве наш правадыр і настаўнік, вялікі машыніст лакаматыва рэволюцыі таварыш **Сталін!**

Народны камісар транспарту тав. Л. М. Каганові ч пачынае сваё ўступнае слова. У гэты час у прэзідыуме з'яўляюцца таварышы **В. М. Молатаў і К. Е. Варашылаў.** Громам воплескаў, бурнай авацыяй, крыкамі «ўра» вітаюць іх чыгуначнікі.

Тав. **Каганові ч** у сваёй яркай і вобразнай прамове, неаднаразова прарываемай воплескамі і крыкамі «ўра», гаворыць аб вялікім значэнні перамог, атрыманых транспартам, аб вялікіх адказных задачах, якія зараз стаяць перад чыгуначнікамі, гаворыць пра таго, хто натхніў усю краіну і ўсіх чыгуначнікаў, пра таго, хто бясстрашна вядзе нас наперад — пра першага машыніста лакаматыва рэволюцыі, пра роднага і блізкага нашага правадыра і настаўніка таварыша **Сталіна.**

Бясконцымі авацыямі, воклічамі захаплення адказвае зала на апошнія словы свайго наркома. У адзіным парыве ўся зала пяе «Інтэрнацыянал».

Тав. Л. М. Каганові ч дае першае слова лешнаму машыністу СССР тав. **Крываносу.** Тав. Крыванос падымаецца на трыбуну разам з групай лепшых стаханаўцаў транспарту, якія нясуць свой падарунак вялікаму **Сталіну**—велізарную дасканала зробленую мадэль магутнага паравоза.

Па сканчэнні яго прамовы тав. Молатаў агалашае: «Няхай жыве слаўная армія совецкіх чыгуначнікаў і іх кіраўнік тав. Каганові ч! Ура!». Магутнае адказнае «ўра» і воклічы «Няхай жыве кіраўнік урада нашай вялікай радзімы тав. Молатаў!» — нясуцца з залы.

У далейшых спрэчках выступілі таварышы **Огнеў** (машыніст дэпо Тула), Мешчэракоў (галоўны кандуктар ст. Качэтоўка), **Трэцякоў** (дарожны майстар Томскай чыгункі) і інш.

З прапановай аб заключэнні дагавору сацыялістычнага спаборніцтва выступае начальнік Цэнтральнага кіраўніцтва эксплаатацыі НКШЗ тав. **Білін.**

Спаборнічаць будуць: паравознікі з эксплаатацыйнікамі і пуцейцамі; пуцейцы з сувязістамі і паравознікамі; эксплаатацыйнікі з вагоннікамі і паравознікамі; заводы транспартнага машынабудаўніцтва з паравоза- і вагонарамонтнымі заводамі.

З вялікім уздымам прымае нарада прывітанне правадыру народаў таварышу Сталіну. Бурныя доўгія воплескі, крыкі «ўра», спяванне «Інтэрнацыянала» пакрываюць апошнія словы прывітання.

З напружанай увагай выслухоўваюць прысутныя палкую заключную прамову тав. Каганові ча.

Тав. Каганові ч заклікае ўсю армію чыгуначнікаў па-баявому разгарнуць ленінска-сталінскае спаборніцтва, вышэйшым этапам якога з'яўляецца стаханаўска-крыванасаўскі рух.

Тав. Каганові ч закончыў сваю заключную прамову. Зноў у адзіным парыве падняліся ўсе прысутныя і адказалі на словы свайго любімага наркома бурай воплескаў, доўгай авацыяй.

К 12 гадзінам ночы закончылася нарада чыгуначнікаў у Крэмлі.

ПАПРАЎКА

У апублікаванай у газеце «Звязда» ад 12 красавіка 1936 г. пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Аб мерапрыемствах па павышэнню ўраджайнасці, кантрактацыі і загатовак насення канюшыны ў 1936 г.» у **табліцы № 1** па тэхнічнаму недагляду дапушчан рад скажэнняў лічбаў.

№№ п/п	Назва раёнаў	Надрукавана: Усяго закласці насенных рассаднікаў канюшыны.	Надрукавана: Усяго з пасеву канюшыны мінулых год пакінута на насенне.	Належыць чытаць: Усяго закласці насенных рассаднікаў канюшыны.	Належыць чытаць: Усяго з пасеву канюшыны мінулых год пакінута на насенне.
1.	Аршанскі	—	1500	—	1200
2.	Асвейскі	—	400	—	320
3.	Багушэўскі	—	600	—	420
4.	Бешанковіцкі	—	950	—	660
5.	Ветрынскі	—	550	—	380
6.	Віцебскі	—	900	—	630
7.	Гарадоцкі	—	500	—	350
8.	Горацкі	—	630	—	440
9.	Дрысенскі	—	1200	—	830
10.	Дрыбінскі	—	540	—	440
11.	Дубровенскі	—	720	—	500
12.	Касцюковіцкі	—	400	—	500
13.	Клімавіцкі	—	330	—	400
14.	Круглянскі	570	1010	570	700
15.	Крычаўскі	—	400	—	450
16.	Лепельскі	—	400	—	280
17.	Лёзнянскі	—	1150	—	800
18.	Магілеўскі	—	800	—	970
19.	Мехаўскі	—	600	—	410
20.	Мсціслаўскі	—	850	—	660
21.	Полацкі	—	530	—	370
22.	Расонскі	—	450	—	310
23.	Сенненскі	—	600	—	420
24.	Сіроцінскі	—	650	—	450
25.	Суражскі	—	830	—	570
26.	Талачынскі	1000	1590	1000	1100
27.	Ушацкі	—	500	—	350
28.	Халопеніцкі	—	420	—	290
29.	Хоцімскі	—	380	—	450
30.	Чашніцкі	—	520	—	360
31.	Чавускі	—	500	—	550
32.	Шклоўскі	—	600	—	620
33.	Асіпавіцкі	—	350	—	420
34.	Бабруйскі	—	550	—	700
35.	Барысаўскі	—	400	—	420
36.	Бялыніцкі	—	500	—	620
37.	Бярэзінскі	—	450	—	600
38.	Быхаўскі	—	430	—	520
39.	Веткаўскі	—	230	—	330
40.	Буда-Кашалёўскі	—	340	—	480
41.	Гомельскі	—	200	—	250
42.	Добрушскі	—	150	—	200
43.	Журавіцкі	—	250	—	310
44.	Жлобінскі	—	310	—	360
45.	Кармянскі	—	250	—	290
46.	Клічаўскі	—	400	—	600
47.	Кіраўскі	—	500	—	630
48.	Крупскі	—	420	—	500
49.	Менскі	—	1500	—	1700
50.	Прапойскі	—	300	—	380
51.	Пухавіцкі	—	500	—	600
52.	Рагачоўскі	—	460	—	560
53.	Смілавіцкі	—	600	—	750
54.	Рэчыцкі	—	250	—	350
55.	Свяцілавіцкі	—	100	—	130
56.	Смалявіцкі	—	650	—	800
57.	Церахаўскі	—	200	—	260
58.	Уваравіцкі	—	380	—	480
59.	Чачэрскі	—	200	—	200
60.	Чэрвеньскі	—	650	—	770
61.	Чырвонапольскі	—	200	—	240
62.	Чэрыкаўскі	—	300	—	420
63.	Бягомльскі	—	250	—	310
64.	Брагінскі	—	180	—	280
65.	Глускі	—	300	—	380
66.	Грэскі	480	700	480	640
67.	Дзяржынскі	810	1000	810	1100
68.	Даманавіцкі	—	170	—	260
69.	Ельскі	—	140	—	210
70.	Жыткавіцкі	—	100	—	120
71.	Заслаўскі	—	700	—	860
72.	Капыльскі	980	1350	980	1420
73.	Камарынскі	—	100	—	130
74.	Капаткевіцкі	—	100	—	160
75.	Лагойскі	—	850	—	1040
76.	Лельчыцкі	—	90	—	110
77.	Лоеўскі	—	200	—	300
78.	Любаньскі	—	350	—	450
79.	Мазырскі	—	150	—	280
80.	Нараўлянскі	—	80	—	100
81.	Плешчаніцкі	—	300	—	380
82.	Парыцкі	—	150	—	230
83.	Петрыкоўскі	—	80	—	110
84.	Слуцкі	760	1000	760	1160
85.	Старадарожскі	—	200	—	240
86.	Старобінскі	360	610	360	660
87.	Тураўскі	—	120	—	150
88.	Уздзенскі	450	450	450	490
89.	Чырвонаслабодскі	590	900	—	920
90.	Хойніцкі	—	280	590	400
	Разам	6.000	45.000	6.000	45.000

Сакратарам райкомаў КП(б)Б Старшыням райвыканкомаў Дырэктарам МТС

БРАГІНСКАГА, ДАМАНАВІЦКАГА, ЕЛЬСКАГА, КАМАРЫНСКАГА, КАПАТКЕВІЦКАГА, МАЗЫРСКАГА, НАРАЎЛЯНСКАГА, ПЕТРЫКОЎСКАГА РАЁНАЎ.

На 10 красавіка па Брагінскаму раёну засеяна зернавых у калгасным сектары 647 гектараў, радковымі сеялкамі МТС не засеяна нічога; па Даманавіцкаму раёну засеяна 2.608 гектараў, радковымі сеялкамі МТС — нічога; па Ельскаму раёну засеяна 2.700 гектараў, сеялкамі МТС — 9 гектараў; па Камарынскаму раёну засеяна 1.267, сеялкамі МТС — нічога; па Капаткевіцкаму раёну засеяна 2.511 гектараў, сеялкамі МТС — нічога; па Мазырскаму раёну засеяна 1.419 гектараў, сеялкамі МТС — 12 гектараў; па Нараўлянскаму раёну засеяна 1.693 гектары, сеялкамі МТС — 10 гектараў; па Петрыкоўскаму раёну засеяна 1.227 гектараў, сеялкамі МТС — нічога.

Такое становішча гаворыць аб грубейшым парушэнні дырэктыў партыі і ўрада аб радковай сяўбе — важнейшым мерапрыемстве, забяспечваючым павышэнне ўраджайнасці. Соўнарком і ЦК КП(б)Б катэгарычна патрабуюць скарыстання ўсіх трактарных, конных радковых сеялак, безагаворачна не толькі выканаць, але і перавыканаць план радковай сяўбы. Соўнарком і ЦК КП(б)Б сур'ёзна папярэджваюць аб строгай адказнасці за зрыў плана радковай сяўбы.

ГАЛАДЗЕД, ВАЛКОВІЧ.

Х УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД ВЛКСМ

Урачыстае пасяджэнне з'езда з прадстаўнікамі флота

15 красавіка ўвечары ў Вялікім тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне Х усесаюзнага з'езда ленінскага комсамола з прадстаўнікамі Чырвонай арміі.

У прэзідыуме з'езда — намеснік народнага камісара абароны, армейскі камісар першага ранга тав. **Гамарнік,** начальнік генеральнага штаба РСЧА, маршал Совецкага Саюза тав. **Егораў,** маршал Совецкага Саюза тав. **Будзённы,** начальнік морскіх сіл, флагман флота першага ранга тав. **Орлоў,** начальнік ваенна-паветраных сіл, камандарм другога ранга тав. **Алкснісі.**

Дэлегаты і госці, перапоўніўшыя ўсе ярусы велізарнай тэатральнай залы, сустракаюць слаўных палкаводцаў рабочага класа сардэчнай авацыяй.

Калі змаўкае гул брацкіх прывітанняў у гонар Чырвонай арміі і яе баявога камандавання, калі сціхае на некаторы час звонкае комсамольскае «ўра», тав. **Косарэў,** адзеты ў форму падшэфнага ленінскаму комсамолу ваенна-паветранага флота, выступае з кароткім прывітальным словам. Ад імя ўсёй шматмільённай комсамоліі перадае ён палкае брацкае прывітанне несакрушальнай доблеснай абаронніцы сацыялістычнай радзімы — Чырвонай арміі, яе магутным морскім і паветраным сілам, падшэфным ВЛКСМ.

Тав. Косарэў запаўняе народнага камісара абароны, першага маршала Саюза ССР тав. Варашылава, усіх маршалаў Совецкага Саюза, што ленінскі комсамол, не супакойваючыся на дасягнутым, узмоцніць сваю работу па шэфству над морскім флотам, над ваеннай авіяцыяй, па падрыхтоўцы для іх дысцыплінаваных, культурных, высокасвядомых байцоў.

Сваю гарачую прамову тав. Косарэў заканчвае словамі:

— Няхай жыве наша рабоча-сялянская Чырвоная армія!

— Няхай жывуць падшэфныя нам ваенна-морскі і ваенна-паветраны флоты!

— Няхай жыве народны камісар абароны тав. Варашылаў!

— Няхай жыве наша партыя, яе геніяльны правадыр, арганізатар перамог соцыялізма тав. Сталін!

Усе прысутныя падымаюцца са сваіх месц і наладжваюць доўгую палкую авацыю ў гонар вялікага Сталіна, у гонар Чырвонай арміі і яе правадыра тав. Варашылава.

На трыбуне — начальнік морскіх сіл, флагман флота першага ранга тав. **Орлоў.** У наступіўшай пішыні дэлегаты і госці з напружанай увагай слухаюць словы яго баявога рапарту Х комсамольскаму з'езду.

Начальнік морскіх сіл краіны запаўняе з'езд, што чырвоныя маракі гатовы ў любы момант на першаму патрабаванню партыі, па першаму патрабаванню совецкага ўрада з гонарам выканаць свой баявы абавязак.

Доўгімі і бурнымі воплескамі, гарачымі прывітальнымі воклічамі праводзіць з'езд прадстаўніка падшэфных маракоў, гэтых пільных вартавых нашых водных рубяжоў, першага ваенмора тав. Орлова.

Некалькі секунд пішыні — і вось ужо новая хваля авацый пракатваецца па зале: слова прадастаўляецца начальніку ваенна-паветраных сіл, камандарму другога ранга тав. **Алкснісу.** Ён рапартуе высокаму шэфу баявой совецкай авіяцыі, што палітыка-маральнае становішча яе добрае, дысцыпліна моцная, арганізаванасць высокая, што яна мае ўжо тысячы лётчыкаў, смелых, адважных, якія ўладаюць у дасканаласці сучаснай найскладанейшай ваенна-паветранай тэхнікай.

Тав. Алкснісі горача дзякуе двойчы чырвонасцяжнаму ленінскаму комсамолу за яго плённую шэфскую работу. Ён таксама просіць гэту работу ў далейшым не толькі прадаўжаць, але і з кожным днём узмацняць.

Начальнік ваенна-паветраных сіл урачыста абяцае з'езду, што чырвоныя лётчыкі прыкладуць усе сілы да таго, каб лятаць вышэй, далей, хутчэй за ўсіх.

З'езд доўга і горача апладзіруе тав. Алкснісу, вітаючы ў яго асобе гордых сокалаў нашай радзімы.

Камандзір часці падводных лодак Ціхаакіянскага флота тав. **Халасцякоў,** пасланы ў свой час комсамолам ва флот радавым чырвонафлотцам, рапартуе аб тым, што за час, які аддзяляе дзесяты з'езд ад дзевятага, створан моцны Ціхаакіянскі ваенна-морскі флот, яго байцы гатовы ў любы момант нанесці смяротны ўдар усякаму, хто адважыцца напасці на свяшчэнную совецкую зямлю.

Залу запаўняюць гукі фанфар. Чутны чоткія словы ваеннай каманды. З'езд прышла вітаць шматлікая дэлегацыя часцей маскоўскага гарнізона ў складзе прадстаўнікоў самых розных родаў зброі.

Магутным звонкім комсамольскім «ура» ў гонар непераможных абаронцаў совецкіх граніц закончылася гэта незабыўная брацкая сустрэча шэфаў і падшэфных, гэта велічная і грозная дэманстрацыя несакрушальнага баявога адзінства Чырвонай арміі і яе незлічоных рэзерваў.

* * *

Пасля ўрачыстага пасяджэння ў Вялікім тэатры ў гонар дэлегатаў Х з'езда ВЛКСМ адбыўся вялікі бліскучы канцэрт чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці з удзелам чырвонасцяжнага ансамблю чырвонаармейскай песні і танцаў, чырвонаармейскіх самадзейных аркестраў, хору маскоўскага гарнізона, зводнага духавога аркестра маскоўскага гарнізона.

Ранішняе пасяджэнне 16 красавіка

На ранішнім пасяджэнні з'езда з заключным словам выступіў сакратар ЦК ВЛКСМ тав. **Косарэў,** спатканы бурнымі апладысментамі.

Тав. Косарэў заклікаў з'езд, увесь актыў ленінскага комсамола мабілізаваць усе свае сілы на вырашэнне гістарычных задач, пастаўленых партыяй і вялікім Сталіным перад комсамолам у галіне асветы і комуністычнага выхавання моладзі і дзяцей.

Тав. Марцінаў ад імя украінскай, маскоўскай і ленінградскай дэлегацый прапануе прыняць наступную рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу тав. Косарэва аб рабоце ЦК ВЛКСМ:

«Х УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА ЦАЛКАМ І ПОЎНАСЦЮ АДАБРАЕ ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ І ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВЛКСМ».

Пад бурныя апладысменты дэлегатаў рэзалюцыя прымаецца **аднагалосна.**

Да стагоддзя Горацкага сельгасінстытута

Сёлета спаўняецца стагоддзе існавання Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. Для падрыхтоўкі і правядзення юбілею пастановай Бюро ЦК КП(б)Б створана спецыяльная камісія. У склад камісіі ўваходзяць тт. Дзьякаў (старшыня), Галадзед, Валковіч, Чарвякоў, Саакян, Бенек, Картукоў, Пелікан і Кісялёў. (БЕЛТА).

Партыйнае будаўніцтва

НЕ ЗРАБІЛІ ВЫВАДАЎ

У пачатку лютага магілеўская партыйная арганізацыя пачала рыхтавацца да абмену партыйных дакументаў. Аб тым, на якім узроўні праходзіла падрыхтоўка сведчаць наступныя факты.

У Храпелеўскай партгрупе па дакладу прадстаўніка райкома выступіў адзін чалавек. На сходзе слабодскай партгрупы, які быў 20 лютага па дакладу з 9 прысутных ніхто не выступіў. Рашэнне прынята больш чым анекдатычнае:

«Па аўторках і пятніцах праводзіць статут партыі».

Не лепш былі праведзены сходы і ў буйнейшых партарганізацыях раёна. На шаўковай фабрыцы, на заводзе імя Дзімітрава і іншых прадпрыемствах партыйныя сходы, не гледзячы на тое, што там прысутнічалі прадстаўнікі райкома партыі, праходзілі не на дастатковай палітычнай вышыні, без крытыкі і самакрытыкі.

Увесь першы этап падрыхтоўкі да абмену партыйных дакументаў у магілеўскай партарганізацыі паказаў, што ў некаторых звенях арганізацыі наступіла самазадаволенасць і благадушнасць.

Новае кіраўніцтва райкома партыі паўторна правяло партыйныя сходы. Быў праведзен агульны сход комуністаў горада. Гэтыя сходы праходзілі больш самакрытычна, на больш высокай палітычнай вышыні. Падрыхтоўку да абмену партыйных дакументаў пачалі зноў, пачалі лепш.

Важна адзначыць тое, што пасля таго пераломy, які наменіўся ў апошнія дні, былі выяўлены ў арганізацыі і трацкісты, і кулакі, і бундаўцы і іншыя ворагі партыі.

Але пералом, які адбыўся пасля агульнага схода гарадской партарганізацыі, яшчэ не замацаван. Аб гэтым сведчаць такія факты, што з партарганізацыі шаўковай фабрыкі на абмен партыйных дакументаў прышоў Мамантаў, які з кастрычніка месяца мінулага года не плоціць членскіх партыйных узносаў.

Аб незразуменні сутнасці абмену партдакументаў гаворыць і такі факт — член партыі тав. Караткевіч прышоў на абмен партбілетаў са спытам, у якім былі запісаны стэрыатыпныя адказы па ўсіх пунктах статута партыі.

Сакратар райкома тав. Клімчук папрасіў тав. Караткевіча расказаць аб тым, што таварыш Сталін у гутарцы з Говардам гаварыў аб канстытуцыі. Караткевіч заявіў:

— Па гэтаму пытанню я не падрыхтаваўся.

Шпаргалка не дапамагла.

Караткевіч у магілеўскай арганізацыі не адзінокі. Тут многія яшчэ разумеюць абмен партдакументаў, як вучнёўскія экзамены. Комуніст Звяркоў з'яўляецца майстрам на шаўковай фабрыцы. Ён лічыў, што на абмен партдакументаў прышоў падрыхтаванным.

Тав. Клімчук папрасіў яго расказаць аб рабоце стаханаўцаў. Аказалася, што Звяркоў не ведае стаханаўцаў сваёй брыгады.

Відаць, не ўсе звенні магілеўскай арганізацыі, не ўсе комуністы вразумелі палітычнага значэння абмену партбілетаў, не ўсвоілі рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) і тых прамых указанняў, якія магілеўскай партарганізацыі былі даны бюро ЦК КП(б)Б.

ЯН ПАУЛОУСКІ.

Рыхтуемся да абмену

Партыйная арганізацыя станцыі Менск МБВ чыгункі пачала падрыхтоўку да абмену партыйных дакументаў з прапрадоўкі рашэння снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) на партыйным сходзе і ў сетцы партвучобы.

Калі мы пачалі займацца кожным комуністам паасобна, то выявілі, што ў партыйнай сетцы склад слухачоў падабраны не па ўзроўню ведаў. Ні адна школа не займаецца па праграме, а толькі бягучай палітыкай. Мы перабудавалі сетку партвучобы, укамплектавалі гурткі, выходзячы з узроўню ведаў комуністаў. Устанавілі вучобу выключна па праграме — усе астатнія пытанні абмяркоўваюцца на партыйных сходах і партгрупах.

У працэсе вывучэння людзей мы выявілі адстаючых таварышоў, прымацавалі да іх больш падрыхтаваных комуністаў для індывідуальнай вучобы. Зараз гэтыя адстаючыя вывучылі статут і праграму партыі, разбіраюцца ў пытаннях бягучай палітыкі.

Станцыя Менск прыходзіць да абмену партыйных дакументаў з радам дасягненняў у вытворчай рабоце. Стаханаўская дэкада на вузле паказала, што ёсць велізарныя нявыкарыстаныя рэзервы. Калі за люты месяц прастой вагона ў нас раўняўся 13 гадзінам, то ў стаханаўскую дэкаду і пасля стаханаўскай дэкады мы трымаем вагон у сярэднім у дзень 10 гадзін. План пагрузкі мы сістэматычна перавыконваем (120 проц.).

Асноўную ўвагу мы звярнулі на ўмацаванне нізавога партыйнага звяна. Абгаварылі на партгрупах пісьмо Дзюканава аб метадах пастаноўкі партработы ў цэху і брыгадзе. На сёнешні дзень тры партгрупы тт. Шэрмана, Канстанціновіча і Сачыхіна з'яўляюцца поўнасцю стаханаўскімі.

Недастаткова яшчэ работа з групай спачуваючых. Праўда, усе спачуваючыя займаюцца ў школах, але многія з іх яшчэ не ўцягнуты ў штодзённае партыйнае жыццё.

Парторг станцыі Менск
КАЖДАН.

Аб узнагародзе ў адзнаку Міжнароднага комуністычнага жаночага дня—8 сакавіка работніц і калгасніц—стаханавак граматамі ўрада БССР

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

Адзначаючы вялікую ролю працоўных жанчын у справе паспяховага вырашэння задач соцыялістычнага будаўніцтва, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

У адзнаку Міжнароднага комуністычнага жаночага дня — 8 сакавіка, за прапоўны гераізм, за выдатную ударную работу, якая сведчыць аб бязмежнай адданасці справе комуністычнай партыі і совецкай улады, узнагарадзіць граматамі ЦВК і СНК БССР наступных работніц і калгасніц — стаханавак БССР:

1. Ансельрод Ф. І., стаханаўку фабрыкі «КІМ» — г. Менск.
2. Андрэйчыкаву Е., стаханаўку Магілеўскай шаўковай фабрыкі.
3. Берэсневіч Л. І., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік»—г. Менск.
4. Белякоўскую В. П., стаханаўку завода імя Мяснікова—г. Менск.
5. Бельцаву А. Г., стаханаўку Гомсельмаша.
6. Бабошка Н. К., стаханаўку калгаса «Брыгадзір», Аршанскага раёна.
7. Бабічаву І. Г., стаханаўку соўгаса «Труд калгас» НКУС, Магілеўскага раёна.
8. Балвановіч В., стаханаўку соўгаса «Іскрышэва», Грэскага раёна.
9. Баберка Д., стаханаўку калгаса «Прамень Комуны», Старобінскага раёна.
10. Ваўчок Л. Ф., стаханаўку фабрыкі імя Крупскай—г. Менск.
11. Вінакураву М. С., стаханаўку завода «Большэвік»—г. Менск.
12. Варакса В. К., стаханаўку галантарэйнай фабрыкі імя Куйбышэва — г. Менск.
13. Вілевіч Д. М., стаханаўку фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» —г. Віцебск.
14. Візнер А. П., стаханаўку калгаса «Ленінскі шлях», Аршанскага раёна.
15. Влацэвіч Н., стаханаўку соўгаса «Брашневічы», Талачынскага раёна.
16. Габрыелаву Х. І., стаханаўку друкарні імя Сталіна—г. Менск.
17. Гомельскую Э. А., стаханаўку завода імя Мяснікова—г. Менск.
18. Гегелеву А. С., стаханаўку калгаса «Чырвонаармеец», Магілеўскага раёна.
19. Гецову З. Л., стаханаўку мэблевай фабрыкі імя Халтурына — г. Магілеў.
20. Гомельштэйн Р., стаханаўку лесакамбіната — г. Магілеў.
21. Гапонаву П. М., стаханаўку хлебакамбіната Аршанскага раёна.
22. Гузаравіч О. Л., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік»—г. Рэчыца.
23. Гердзіну М. Г., стаханаўку калгаса «Ленінскі заклік», Крычаўскага раёна.
24. Голуб М., стаханаўку калгаса «Чырвонае сонца», Парышкага раёна.
25. Губаравіч Е., стаханаўку калгаса імя Сталіна, Ушацкага раёна.
26. Грынькову У., стаханаўку соўгаса «Неглюбко», Свяцілавіцкага раёна.
27. Гіцкую А. А., стаханаўку-настаўніцу 13-й менскай школы.
28. Дземідзенка М., стаханаўку шчоткамбіната імя Куйбышэва — г. Віцебск.
29. Дабраволскую Я. М., стаханаўку фабрыкі «КІМ»—г. Гомель.
30. Дарожкіну М. П., стаханаўку калгаса «Чырвоны хлебароб», Гомельскага раёна.
31. Дзерэвяга Е., стаханаўку фабрыкі «Пролетарская перамога» — г. Барысаў.
32. Душкіну М., стаханаўку калгаса імя Фрунзе, Шклоўскага раёна.
33. Дубоўскую М. П., стаханаўку калгаса «Ясная раніца», Старобінскага раёна.
34. Дашчынскую Ф., стаханаўку соўгаса «Комсомольская правда», Багушэўскага раёна.
35. Еўсюціну А. І., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік»—г. Менск.
36. Еўсюціну В. І., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік»—г. Менск.
37. Ефрэмаву Т. М., стаханаўку завода імя Кірава — г. Гомель.
38. Ермакову Е. І.—стаханаўку камбіната «Спартак»—г. Гомель.
39. Жакевіч А. І., стаханаўку завода імя Варашылава—г. Менск.
40. Зыкаву Х., стаханаўку соўгаса «Лучысны», Быхаўскага раёна.
41. Загужэльскую Л., стаханаўку соўгаса «Хотцы», Сенненскага раёна.
42. Ідэльчык Х. Ш., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік» — г. Менск.
43. Кісялёву А. С., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік» — г. Менск.
44. Кочэраву Е. С., стаханаўку завода імя Варашылава—г. Менск.
45. Каган Б. І., стаханаўку 1-й совецкай больніцы — г. Гомель.
46. Кузняцову Г. В., стаханаўку калгаса «Сталінец», Гомельскага раёна.
47. Капытка М. Д., стаханаўку калгаса «Чырвонаармеец», Магілеўскага раёна.
48. Кулік А. С., стаханаўку калгаса «Чырвонае Шанькова», Аршанскага раёна.
49. Корніну Л. В., стаханаўку фабрыкі «КІМ» — г. Віцебск.
50. Камінскую Е. Е., стаханаўку калгаса «Культура», Смалявіцкага раёна.
51. Карнешка Г., стаханаўку соўгаса «Анаполь», Менскага раёна.
52. Кулакоўскую Г., стаханаўку калгаса «Комунар», Хоцімскага раёна.
53. Лабко, стаханаўку-стрэлачніцу — г. Менск.
54. Лапенкову Е. С., стаханаўку Гомсельмаша.
55. Левачкіну А. А., стаханаўку шклозавода імя Сталіна, Гомельскага раёна.
56. Літвінаву Д. В., стаханаўку «Палесдрука» — г. Гомель.
57. Любінскую Д., стаханаўку фанернага завода імя Галадзеда— г. Рэчыца.
58. Лісоўскую Ю., стаханаўку соўгаса «Вялікія Новасёлкі», Дзяржынскага раёна.
59. Лукашову С., стаханаўку соўгаса «Турск», Рагачоўскага раёна.
60. Лямешчанка А., стаханаўку соўгаса «Перамога соцыялізма», Хойніцкага раёна.
61. Мішчэракову Я. С., стаханаўку фабрыкі «КІМ» — г. Менск.
62. Міхееву К. С., стаханаўку фабрыкі «Везувій», Гомельскага раёна.
63. Малахаву Н. Д., стаханаўку калгаса «Інтэрнацыянал», Гомельскага раёна.
64. Міхолап Е. І., стаханаўку швэйнай фабрыкі імя Дзержынскага — г. Магілеў.
65. Мартынаву А. Ф., стаханаўку калгаса «Культфонд», Віцебскага раёна.
66. Мядзведзеву Е. П., стаханаўку калгаса імя Чарвякова, Рэчыцкага раёна.
67. Мароз О., стаханаўку калгаса «Рэволюцыя», Ельскага раёна.
68. Міхасёнак Е., стаханаўку калгаса «Расно», Сенненскага раёна.
69. Немельман З. Л., стаханаўку фабрыкі «Кастрычнік» — г. Менск
70. Навасёлаву М. Е., стаханаўку фабрыкі «Комінтэрн» — г. Гомель.
71. Ніскіну Б. Е., стаханаўку Магілеўскай шаўковай фабрыкі.
72. Новік А., стаханаўку фанернага завода імя Галадзеда — гор. Рэчыца.
73. Ніціценка М. Д., стаханаўку калгаса імя Дзержынскага, Буда-Кашалеўскага раёна.
74. Осіпаву Х. П., стаханаўку калгаса імя Сталіна, Прапойскага раёна.
75. Піліпчык Н. К., стаханаўку завода імя Молатава — г. Менск.
76. Пастуховіч З. В., стаханаўку завода імя Мяснікова — гор. Менск.
77. Попель І. А., стаханаўку фабрыкі імя Клары Цэткін—г. Віцебск.
78. Падокочаву Т., стаханаўку фабрыкі «КІМ» — г. Віцебск.
79. Галеснікаву Л. А., стаханаўку фабрыкі «Чырвоны харчавік»— г. Бабруйск.
80. Подзуо У., стаханаўку калгаса «Свабода», Мехаўскага раёна.
81. Пэрхімовіч Е., стаханаўку соўгаса «Пагост», Старобінскага раёна.
82. Пушкарэнка Л., стаханаўку соўгаса імя Молатава, Камарынскага раёна.
83. Прэабражэнскую Л. Ф., стаханаўку-настаўніцу магілеўскай няпоўнай сярэдняй школы.
84. Папіш Р. Г., стаханаўку-настаўніцу 7-й яўрейскай узорнай школы г. Менска.
85. Раманькову М. Г., стаханаўку чарапічнага завода № 2 — г. Віцебск.
86. Рабаву М. П., стаханаўку фабрыкі «КІМ» — г. Віцебск.
87. Радкевіч Т. І., стаханаўку Аршанскага мясакамбіната.
88. Раманенка М. Т., стаханаўку калгаса «III інтэрнацыянал», Хоцімскага раёна.
89. Раманоўскую Р., стаханаўку калгаса «Шлях соцыялізма», Сенненскага раёна.
90. Свершчук Б. Я., стаханаўку швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» — г. Менск.
91. Свірыдовіч В. Н., стаханаўку 1-й механічнай пякарні — г. Менск.
92. Саламонаву Х. Е., стаханаўку завода «Большэвік»—г. Менск.
93. Стэрліну Г. М., стаханаўку шчотачнай фабрыкі — г. Менск.
94. Сідарэнка М. І., стаханаўку фабрыкі імя Кагановіча—г. Менск.
95. Семянідаву А. К., стаханаўку фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» — г. Віцебск.
96. Суханаву Е. І., стаханаўку чарапічнага завода № 2 — г. Віцебск.
97. Слесараву Д. К., стаханаўку пілота-парашутыста — г. Віцебск.
98. Самцову М. Ф., стаханаўку акулярнай фабрыкі — г. Віцебск.
99. Сарбай Н. Н., стаханаўку фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» — г. Віцебск.
100. Сімкавец А., стаханаўку калгаса «За ўладу Совецкаў», Магілеўскага раёна.
101. Сівакову Т., стаханаўку фабрыкі імя Кірава — Барысаў.
102. Сановіч В. А., стаханаўку калгаса «Чырвоны Берег», Аршанскага раёна.
103. Сянкевіч М. С., стаханаўку калгаса «Пролетарская воля», Бешанковіцкага раёна.
104. Строй Э., стаханаўку соўгаса імя Горкага, Гомельскага раёна.
105. Сапоўаву С., стаханаўку калгаса «Перамога», Дубровенскага раёна.
106. Сталярову К. А., стаханаўку-настаўніцу лельчыцкай беларускай узорнай школы.
107. Цяпліцную С. С., стаханаўку швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» — г. Менск.
108. Тычкову Т. С., стаханаўку вапалкавай фабрыкі «Везувій», Гомельскага раёна.
109. Ташкінову, стаханаўку Магілеўскай шаўковай фабрыкі.
110. Турко Б. К., стаханаўку-настаўніцу Вацлаваўскай школы Ушацкага раёна.
111. Федарэнка М., стаханаўку фабрыкі «Х Кастрычнік» — г. Рэчыца.
112. Хадасевіч Г. К., стаханаўку фабрыкі «Комунарка» — г. Менск.
113. Хаўкіну І. І., стаханаўку фабрыкі «Праца» — г. Гомель.
114. Шынкевіч З. Н., стаханаўку менскага хлебазавода.
115. Шляхта А. І., стаханаўку Гомсельмаша.
116. Шэрман Д. М., стаханаўку фабрыкі імя К. Цэткін — г. Гомель.
117. Шулякову Т. П., стаханаўку Гомсельмаша.
118. Шат А. М., стаханаўку аршанскай ільнофабрыкі.
119. Шарыпа У. М., стаханаўку Белдрэса.
120. Шыло К., стаханаўку калгаса імя Леніна, Бабруйскага раёна.
121. Шнітко М. В., стаханаўку калгаса «Профінтэрн», Дрыбінскага раёна.
122. Шчукіну Н. П., стаханаўку абутковай фабрыкі імя Лекерта — г. Віцебск.
123. Чарапахіну Ф. Х., стаханаўку фабрыкі імя Кагановіча — г. Менск.
124. Чарнасеву В., стаханаўку фабрыкі «КІМ» — г. Віцебск.
125. Чарнову Н., стаханаўку шклозавода імя Сталіна — г. Гомель.
126. Чарніцкую Ш. А., стаханаўку магілеўскай швэйнай фабрыкі імя Валадарскага.
127. Чундзееву В. Д., стаханаўку чэрыкаўскага дзіцячага дома.
128. Юхнаўцову Л. А., стаханаўку фабрыкі «Везувій» — г. Гомель.
129. Яцкевіч А. Ф., стаханаўку магілеўскага скуразавода імя Сталіна.
130. Ястрамскую Э., стаханаўку фанернага завода «Звязда», Капаткевіцкага раёна.
131. Яскамчык М. С., стаханаўку соўгаса «Рачкавічы», Чырвонаслабодскага раёна.
132. Зайцаву, стаханаўку-боатэхніка, Чашніцкага раёна.
133. Ніціцыну У. З., стаханаўку фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік», Аршанскага раёна.
134. Сафранкову Л. М., стаханаўку калгаса «Чырвоная зорка», Расонскага раёна.
135. Ханіну Ж. С., стаханаўку, дырэктара фабрыкі імя К. Цэткін — г. Віцебск.
136. Кароткую П. К., стаханаўку калгаса «Культура», Аршанскага раёна.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

5 красавіка 1936 г.
г. Менск.

80-ГОДДЗЕ ТОМА МАНА

ПРЫВІТАННЕ ВЫКАНКОМА КОМІНТЭРНА ТОМУ МАНУ

«ДЭЙЛІ УОРКЕР». ЛОНДАН

Прэзідыум Выканкома Комуністычнага Інтэрнацыянала шле Вам, дарагі таварыш Том Ман, сваё палкае прывітанне ў сувязі з Вашым васьмідзесяцігоддзем.

60 з лішкам год таму назад Вы ўступілі на цярністы, але слаўны шлях арганізатара і перадавога барацьбіта рабочага класа ў яго актыўнай барацьбе за вызваленне ад капіталістычнага падняволення і імперыялістычнага прыгнечання.

Мы радуемся таму, што не толькі ў Англіі, Паўднёвай Афрыцы, Аўстраліі, не толькі па ўсёй Брытанскай імперыі, але і ва ўсіх краінах свету мільёны прапоўных выказваюць з любоўю імя Тома Мана, якое з'яўляецца сімвалам безагаворачнай адданасці справе рабочага класа, справе барацьбы за нацыянальнае і міжнароднае адзінства профруху, справе сацыялізма.

Вы можаце з вялікім задаваленнем глядзець сёння на ажыццяўленне вашых самых лепшых надзей, — на перамогу сацыялізма, які вастаржэствае на адной шостай частцы зямнага шара, у вялікай краіне Совецаў. Мы жадаем Вам усім сэрцам жыць і змагацца яшчэ доўгія гады пад сцягам Комуністычнага Інтэрнацыянала — на карысць міжнароднага пролетарыята і на зло ашалелым яго класавым ворагам і падпальшчыкам новай імперыялістычнай вайны.

По даручэнню Прэзідыума ВККІ
Г. ДЗІМІТРАЎ.

АБ НАЗНАЧЭННІ ТАВ. ДЗЬЯКАВА А. І. НАРОДНЫМ КАМІСАРАМ АСВЕТЫ БССР

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага камітэта БССР пастанаўляе:

Назначыць тав. Дзьякава Ананія Івзнавіча народным камісарам асветы БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

15 красавіка 1936 г.
г. Менск.

Тав. Дзьякаў А. І.

„МІРНЫ" ПРАЕКТ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ ВАЙНЫ

Некалькі дзён таму назад адна з вельмі распаўсюджаных французскіх газет «Пары мідзі» прысвяціла вялікі артыкул узмацненню небяспекі германскай паветранай атакі на жыццёвыя цэнтры Францыі ў сувязі з заняццем германскімі войскамі дэмілітарызаванай Рэйнскай зоны. Газета ўказвала, што ў гэтай зоне германская ваенная авіяцыя атрымала ўжо гатовых 23 аэрадромы і што нават найбольш павольна перасоўваючыяся германскія бамбардыроўшчыкі могуць пяпер дасягнуць Парыжа менш чым за дзве гадзіны.

Аўтар артыкула, як відаць, спецыяліст сваёй справы, тлумачыць, што тыя некалькі дзесяткаў кілометраў, на якія наблізілася германская авіяцыя да граніц Францыі пасля 7 сакавіка, могуць мець істотнае значэнне. Розніца ў адлегласці дазваляе самалётам браць менш запасаў гаручага і адпаведна павялічваць груз выбуховых матэрый.

Кампетэнтны аўтар з «Пары мідзі» не схілен, між іншым, аддаць правярнай паніцы, або запалохаць без патрэбы насельніцтва Францыі. Ён указвае, што французская авіяцыя ўладае дастатковымі ёрэдкамі для разгорнутай рэптоўнай атакі на германскія гарады, якія знаходзяцца недалёка ад французскай граніцы. Па словах аўтара, ужо прыняты меры, каб паветраная контратака магла быць разгорнута ў самы кароткі тэрмін. Аўтар прыходзіць, нарэшце, да выводу, што ў выпадку раптоўнай германскай паветранай атакі французскія бомбы пачалі-б разбураць нямецкія гарады амаль адначасова з тым, як германскія самалёты з'явіліся-б над Парыжам.

Для нас сутнасць пытання заключаецца не ў тым, якія ваенна-тэхнічныя перавагі мае раптоўная паветраная контратака перад іншымі відамі паветранай абароны. Сапраўдны сэнс з'яўлення такога артыкула ва французкай газеце значна глыбей, чым звычайныя разважанні ваеннага спецыяліста. Глыбокі палітычны сэнс гэтага артыкула ў тым, што ён рысуе настрої, пануючыя ў Еўропе пасля нахабнага парушэння гітлераўскай Германіяй добраахвотна прынятых ёю на сябе міжнародных абавязацельстваў. Гэтыя настрої сведчаць аб надзвычайнай трывозе, ахапіўшай ва ўсёй Еўропе тыя элементы, якія шчыра не хочуць развязвання новай вайны.

Мы ведаем, што гэты крок фашысцкага ўрада Германіі не выклікаў неадкладнага і аднадушнага адпору ні з боку непасрэдна прымаўшых удзел у лакарнскім дагаворы дзяржаў, ні з боку надзвычайнай сесіі Совета Лігі нацый, якая сабралася ў Лондане. Патрабаваліся амаль два тыдні ўпартай барацьбы і жорсткага дыпламатычнага гандлю для таго, каб распрацаваць дакумент, вядомы пад імем «прапаноў лакарнскіх дзяржаў» і апублікаваны ў Англіі пад назвай «Белай кнігі».

Вядома таксама, што Гітлер адклаў свой адказ на гэтыя прапановы да правядзення ў Германіі так званых «выбараў» у рэйхстаг.

Рэзультаты «выбараў» аказаліся, зразумела, іменна такімі, як гэтага хацелі іх ржысёры. Фашысцкі ўрад сабраў ледзь не 99 проц. усіх паданых галасоў. Адна з англійскіх буржуазных газет, здзекваючыся над гэтымі статыстычнымі фокусамі, з поўным правам заявіла, што ў тых умовах, у якіх праходзілі «выбары», фашысцкі ўрад мог сабраць нават 101 проц. паданых галасоў.

Думка гэтай газеты не была выключэннем. Друк усяго свету па вартасці ацаніў «выбарную» інсцэніроўку германскіх фашыстаў.

Тым не менш германскі адказ на прапановы лакарнскіх дзяржаў быў паднесен не як чарговы маневр фашысцкай дыпламатыі, чым ён з'яўляецца на самой справе, а ледаь не як сапраўднае волевыяўленне германскага народу.

Гэты дакумент заслужана падпаў надзвычай суровай крытыцы ў пераважнай большасці краін Еўропы.

Адказ Германіі, які ўяўляе сабой надзвычайна вялікі, з 32 пунктаў дакумент, афіцыяльна імянуецца: «Мірны праект германскага ўрада ад 31 сакавіка 1935 года». Сапраўды, поўнасцю абвергнуўшы з такімі труднасцямі выпрацаваныя прапановы лакарнскіх дзяржаў, Германія прапанавала свой праект, які быццам павінен забяспечыць мір у Еўропе.

Аднак, знайшлося ў Еўропе надзвычай мала людзей, якія-б прызналі, што праект сапраўды накіраваны да ўмацавання міру. Значна мацней і больш пераканаўча гучаць тыя галасы, якія даюць яму прама пропілеглую ацэнку. Напрыклад, вядомы французскі журналіст Бургес, які лічыцца аўтарытэтным журналістам, маючым сувязі з міністэрствам замежных спраў, на наступны дзень пасля апублікавання германскага адказу пісаў:

«Змест гітлераўскага «мірнага» плана, пераданага ўчора Рыбентропам Ідэну, у сэнсе развязнасці і дэвудушнасці перавышае ўсё, што можна было ўявіць. Пры першым чытанні гітлераўскага плана ствараецца толькі ўражанне велізарнай нахабнасці. Германія заяўляе аб сваёй гатоўнасці заключыць пакты аб ненападзе з дзяржавамі, размешчанымі на паўднёвы ўсход і паўночны ўсход ад яе граніцы. Аб СССР ні слова, СССР у гэтай сістэме яўна выключан з грамадства народаў і ўвесь план, відэаочна, мяркуе адмену франка-совецкага пакту. Калі прадстаўнікі лакарнскіх дзяржаў збяруцца ў Брусэлі, лепшае, што яны змогуць зрабіць, гэта, несумненна, заявіць аб непрымальнасці плана Гітлера. Яны павінны будуць неадкладна прыняць усе неабходныя меры, каб прымусіць паважаць міжнародныя права, а таксама каб абмежаваць сябе ад усякіх нечаканасцей з боку Германіі».

На самой справе тое, што германскі ўрад назваў сваім «мірным праектам», па сутнасці справы з'яўляецца дакументам, які можа выклікаць толькі ўзмацненне ўсеагульнага неспакою і трывогі.

У гэтым дакуменце, перш за ўсё, кідаецца ў вочы праходзячае чырвонай ніткай праз усе шматлікія параграфы імкненне глыбей убіць клін паміж Англіяй і Францыяй. Германскі ўрад добра ўлічвае і з дастатковай лоўкасцю выкарыстоўвае тыя разгалоссі, якія існуюць унутры палітычных колаў самой Англіі.

Сярод 32 германскіх пунктаў ёсць нямала такіх, якія пры павярхоўнай ацэнцы могуць здавацца дастаткова «прывабнымі» для пэўных плыней у асяроддзі англійскіх дзяржаўных дзеячоў. Тым самым германскі мемарандум павінен паглыбіць разгалоссі ў грамадскай думцы Англіі, у яе кіруючых колах і нават унутры самога англійскага ўрада. Гэта тактыка, несумненна, дала свой эфект. Праўда, англійскі ўрад, калі судзіць па выступленнях міністра замежных спраў Ідэна ў палаце абшчын і па апублікаваных у гэтыя дні рознага роду афіцыяльных заявах, не палічыў германскі адказ поўнасцю прыемлемым. Праўда, англійскі ўрад звярнуўся да Францыі і Бельгіі з пісьмамі адносна ўстанаўлення кантакту паміж генеральнымі штабамі гэтых краін, як гэта было прадугледжана лонданскай згодай лакарнскіх дзяржаў ад 19 сакавіка.

Тым не менш найбольш важным застаецца той факт, што і пасля германскага адказу англійскі ўрад прадаўжае ўпарта захоўваць за сабой ролю пасярэдніка, зусім не жадаючы выступаць у якасці стараны ў канфлікце. Гэта, у прыватнасці, знайшло сваё поўнае адлюстраванне ў тых шматлікіх агаворках і растлумачэннях, якімі запоўнены пісьмы аб згодзе англійскага ўрада на ўстанаўленне кантакту паміж генеральнымі штабамі Англіі, Францыі і Бельгіі.

Вось гэта імкненне павялічыць і паглыбіць англа-французскія супярэчнасці з'яўляецца адной з найбольш характэрных рыс германскага «мірнага праекту».

Але вусім зразумела, што барацьба за калектыўную бяспечнасць была-б выключна затруднена пры адсутнасці актыўных і салідарных намаганняў у гэтым напрамку з боку двух кіруючых заходнееўрапейскіх дзяржаў—Англіі і Францыі. Такім чынам, ужо адно гэта ператварае германскі «мірны праект» у праект прадзеяння арганізацыі сапраўднага міру.

Не менш характэрна пазіцыя германскага ўрада і ў пытанні аб пабудове ўмацаванняў у Рэйнскай зоне. І ў адказе на прапановы лакарнскіх дзяржаў, і ў паследаўчых следам за тым перагаворах Германія ясна дала зразумець, што яна вусім не адмаўляецца ад узвядзення суцэльнага ланцуга ўмацаванняў уздоўж французкай граніцы. Па вестках шматлікіх замежных карэспандэнтаў, падрыхтоўчыя работы для ажыццяўлення гэтага плана ўжо і зараз вядуцца поўным ходам. Лёгка зразумець, якое значэнне магла-б мець пабудова гэтага ланцуга ўмацаванняў для палітычнага становішча ў Еўропе. Францыя аказалася-б закупоранай у крайнім заходнім кутку Еўропы і фактычна не магла-б прыйсці на дапамогу сваім саюзнікам і прыяцелям, калі-б гэтыя апошнія падверглісь нападу з боку фашысцкай Германіі.

Такая яшчэ адна характэрная рыса германскага «мірнага праекту». І яна зноў гаворыць аб тым, што гутарка ідзе не аб арганізацыі міру, а аб арганізацыі вайны.

Германія ў сваім адказе прапануе складаную сістэму пактаў. Пры гэтым для вядомай групы дзяржаў гэта павінны быць дагаворы аб узаемнай дапамозе, а для другіх—толькі двухбаковыя пакты аб ненападзе. Такое дзяленне дзяржаў выклікае законны пратэст у тых краінах, якія прылічаны германскай дыпламатыяй да краін «другога гатунку». Напрыклад, блізкая да аўстрыйскага канцлера Шушніга газета «Нейес вельтблат» піша:

«З пункту гледжання цэнтральных эўрапейскіх краін германскі праект з'яўляецца зусім нездавальняючым. Германскі ўрад па рознаму адносіцца да заходніх краін, з аднаго боку, і да сваіх паўднёвых і ўсходніх суседзяў — з другога. Прапануючы на захадзе стварэнне сістэмы калектыўных пактаў бяспечнасці, а на поўдні і на ўсходзе толькі двухбаковых пактаў, германскі ўрад тым самым адмаўляе раду краін у прынцыповым роўнаправі, у імя якога ён сам парушыў міжнародныя дагаворы. Гэта няшчырасць і двухсэнсныя не можа быць базісам для новых адносін у Еўропе».

Застаецца яшчэ адзін найважнейшы пункт, якому многа ўвагі аддае друк у радзе краін Еўропы. Англійская ліберальная газета «Ньюс кронікл» нядаўна пісала:

«Найбольш трывожным фактам з'яўляецца адсутнасць у германскім адказе на прапановы лакарнскіх дзяржаў якога-б там ні было спасылання на СССР. Калі-б англійскі ці які-небудзь іншы ўрад пашоў на захадзе, на згоду, якая прадстаўляла Германіі магчымасць ажыццявіць свае ваенныя мэты ва Ўсходняй Еўропе, то гэта аказалася-б ракавым для ўсёй калектыўнай сістэмы. Агульная згода застанецца немагчымай, пакуль Гітлер не дасць гарантыю па гэтаму істотнейшаму пункту».

Такім чынам, і ў адносінах да Совецкага Саюза, у гэтым, па выразу англійскай газеты, «істотнейшым пункце» гутарка ідзе не аб арганізацыі міру, але аб арганізацыі вайны.

У гутарцы з Рой Говардам таварыш Сталін гаварыў ужо адносна аднаго з падобных «мірных выступленняў» фашысцкай Германіі. Тады гутарка ішла аб інтэрв'ю Гітлера з карэспандэнтам адной французскай газеты.

«У гэтым інтэрв'ю — сказаў таварыш Сталін — Гітлер як быццам прабуе гаварыць міралюбівыя рэчы, але гэта сваё «міралюбства» ён так густа перасыпае пагрозамі ў адносінах да Францыі і Совецкага Саюза, што ад «міралюбства» нічога не застаецца. Як бачыце, нават тады, калі п. Гітлер хоча гаварыць аб міры, ён не можа абыйсціся без пагроз. Гэта «сімптом».

Гэта трапная характарыстыка «міралюбівых» выступленняў фашысцкай Германіі ў поўнай меры адносіцца і да «мірнага праекту» германскага ўрада, высунутага ім у адказ на прапановы лакарнскіх дзяржаў. Гэтым праектам, які змяшчае ў сабе Манбланы «міралюбівых» прапаноў, германскі ўрад стварае новую і сур'ёзнейшую пагрозу ўсеагульнаму міру.

Перагаворы заходнееўрапейскіх дзяржаў яшчэ прадаўжаюцца. Цяжка яшчэ прадбачыць, да якіх яны прывядуць рэзультатаў. Аднак рост небяспекі, выкліканы самачыннымі дзеяннямі фашысцкай Германіі, павінен падказаць заходнееўрапейскім палітыкам сур'ёзныя вывады. Многія з іх ужо да такіх вываду прыходзяць. Францыя ўжо дала свой вычарпальны адказ на германскі праект, адказ, які адвяргае германскія прапановы і дае свой канструкцыйны план арганізацыі міру.

Характэрна, што перасцерагаючыя галасы раздаюцца нават сярод членаў англійскага ўрада. Так, нядаўна англійскі міністр па справах Індыі лорд Зетлэнд даў, у сваёй прамове выразнае вызначэнне сучаснага палітычнага крызісу, якое было-б вельмі карысна ўсвоіць многім палітычным дзеячам Еўропы.

«Крызіс, які нядаўна так груба парушыў спакой міру,—сказаў англійскі міністр, — выклікан тым фактам, што Германія, аслепленая сваёй станоўчай ваеннай сілай, рашыла прыступіць да вырашэння сур'ёзных міжнародных праблем не з дапамогай разумных довадаў, а з дапамогай гвалту. Мы не можам не ўзяць гістарычнага ўроку з таго, што людзі, якія зараз вызначаюць германскую палітыку, прыбягаюць да гвалту, а не да разумных довадаў, калі толькі яны лічаць гэта магчымым».

Ф. ШПІГЕЛЬ.

За 7—8 мільярдаў пудоў вярна

УЗОРНА ЗАСЕЯЦЬ КОЖНЫ ГЕКТАР

ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ

Менскі раён у гэтым годзе значна лепш мінулых гадоў падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Роўныя рады чыстых азімых, добра ўзараныя рады зяблівa, вольныя ад пустазелля палі — лепшы доказ узорнай работы.

Большасць калгасаў раёна сеюць у гэтым годзе выключна высокаякасным насеннем. Палі добра ўгноены. У Менскім раёне лепш чым ва ўсіх раёнах БССР разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Ва ўсіх брыгадах калгасаў шырока распрацован дагавор БССР з Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі і дагавор соцспаборніцтва Менскага раёна са Слуцкім. Ва ўсіх калгасах Меншчыны разгорнута спаборніцтва на лепшае правядзенне сяўбы.

Менскі раён, бясспрэчна, мае ўсе ўмовы заняць першае месца сярод раёнаў БССР у барацьбе за высокі ўраджай. Зарукай гэтаму — выдатныя людзі, горача адданыя калгаснай справе, партыйныя і непартыйныя большэвікі.

Удзельнік усебеларускай нарады па ўраджайнасці, старшыня калгаса імя Сталіна тав. Грыгаровіч яшчэ залоўга да сяўбы падрыхтаваў кожны ўчастак. Кожны калгаснік ведаў, дзе ён будзе працаваць. У калгасе шырока разгорнута індывідуальнае спаборніцтва. Тав. Грыгаровіч упэўнена заяўляе, што яго калгас выйдзе перадавым па ўраджайнасці. А такіх калгасаў у Менскім мноства. Калгасы Менскай першай МТС засяваюць 150 гектараў яравізаваным насеннем. Зараз падкармліваюць азімыя. Усе гэтыя мерапрыемствы бясспрэчна забяспечаць калгасам раёна высокі ўраджай.

Ордэнаносцы раёна тт. Гарбуз і Бейне, удзельнікі ўсебеларускай нарады па ўраджайнасці, паказваюць узоры большэвіцкай барацьбы за тэмпы і якасць палявых работ, правільную расстаноўку сіл, арганізацыю працы, максімальнае скарыстанне кожнай мінуты. Іх вопыт павінен стаць здабыткам для ўсіх калгасаў раёна.

У раёне засеяны першыя 150 гектараў ранніх яравых. У бліжэйшыя два-тры дні ва ўсіх калгасах і соўгасах раёна разгорнецца масавая сяўба. Трэба таму ўжо зараз павесці рашучую барацьбу з парушэннямі агратэхнічных правіл.

У калгасе імя Фалько, напрыклад, у пагоні за тэмпамі перавана зяблівa на плошчы ў 44 гектары без папярэдняга баранавання. У калгасе «Першы май» абіраюцца сеяць уручную. Высокі ўраджай можа быць заваяваны толькі там, дзе строга будуць захаваны ўсе правілы агратэхнікі, дзе будзе наладжан сістэматычны кантроль якасці сяўбы.

Месца агранома зараз у полі. Цельга мірыцца з такім фактам, калі агранома Большэвіцкай МТС прымушаюць сядзець у канцэляры і складваць зводкі. Аграномы абавязаны аказаць калгасам сістэматычную і канкрэтную дапамогу ў справе дасканалага прымянення агратэхнічных правіл на сяўбе.

Брыгада тав. Палякоўскага (соўгас імя Калініна — Менскі раён) у часе перапынку чытае пастанову СНК БССР і ЦК КП(б)Б аб веснавой сяўбе. Фото КАПЛІНСКАГА.

За сціслыя тэрміны сяўбы

Брыгадзірам працую з дня арганізацыі калгаса. Гэта значыць з 1931 года. Але такой адказнасці я ніколі яшчэ не адчуваў, як адчуваю ў гэту веснавую кампанію. Асноўнае ў гэтым годзе — якасць работы.

У 1935 годзе мы ў калгасе дабіліся нядрэнных вынікаў. З кожнага гектара мая брыгада атрымала па 19,5 цэнтнера аўса. Такога ўраджаю мы дабіліся дзякуючы добрай апрацоўцы глебы. Вясной зяблівa баранавалі, а потым пераворвалі плугамі.

У гэтым годзе мая брыгада змагаецца за 25 цэнтнераў верніўных з гектара. Без паляпшэння якасці работ нам не дабіцца павышэння ўраджаю. Мы дадаем яшчэ адзін від работы ў гэтым годзе — гэта культывізацыя зяблівa, якую зараз заканчваем. Пасля культывізацыі поле робіцца мякчэйшым, лепш выраўноўваецца, і авёс парасце лепшым.

Мы паставілі сабе за правіла ў гэтым годзе ўсе зернавыя культуры сеяць выключна радковымі сеялкамі. У маёй брыгадзе ў поўнай гатоўнасці дзве конныя дыскавыя сеялкі. Будзем сеяць выключна пратручаным насеннем.

Сухая вясна гэтага года асабліва патрабуе ўвагі ад брыгадзіра і ўсёй брыгады. Калі распяцнуць работы на сяўбе, глеба на асобных участках можа вельмі перасохнуць, што дрэнна адаб'ецца на ўраджайнасці. Таму барацьбу за сціслыя тэрміны сяўбы мы ставім, як важнейшую задачу. Мая брыгада разлічвае закончыць сяўбу ўсіх вернавых за 8 дзён.

У мінулым годзе мая брыгада дабілася ўраджаю бульбы 216 цэнтнераў з гектара. У гэтым годзе мы разлічваем дабіцца з кожнага гектара не менш 250 цэнтнераў. Справа, безумоўна нялёгкая. У маёй брыгадзе план сяўбы бульбы 32 гектары, з іх 15 гектараў ранняй. Каб дабіцца такога ўраджаю, трэба ўсе работы выканаць добраякасна.

Зараз мая брыгада падрыхтоўвае глебу да сяўбы. Увесь гной зімовай вывазкі заворваем. На кожны гектар укладваем гною па 3.5000 пудоў.

Я паставіў сваёй мэтай — не вывезці ў поле ні адной нягоднай бульбіны. Трэба дабіцца, каб ні адзін метр зямлі не прападаў дарэмна. Пасадку мы мяркуем зрабіць на адлегласцях 60 сантыметраў баразна ад баразны, а ў барознах на 40 сантыметраў. Такую адлегласць мы лічым лепшай.

Наш калгас уключыўся ў соцыялістычнае спаборніцтва з калгасам імя Дзержынскага. Мы паставілі сваёй задачай у соцыялістычным спаборніцтве заняць першае месца.

Мая брыгада спаборнічае з двума іншымі брыгадамі нашага калгаса. Гэта з брыгадай Паплаўскага і брыгадай Карбановіча.

Іх брыгады таксама старанна працуюць. Летась у маёй брыгадзе быў самы лепшы ўраджай. У гэтым годзе яны хочуць заняць першае месца. Цяпер цяжка сказаць, хто займае першае месца. Кожная брыгада змагаецца за пяршынства. Мая брыгада цвёрда рашыла нікому пяршынства не ўступіць.

ЯКУБОЎСКІ ІГНАТ — брыгадзір калгаса імя ДПУ, Менскага раёна.

АПРАЎДАЮ ВЫСОКУЮ ЎЗНАГАРОДУ

Прайшло поўмесяца, як мы агульным сходае калгаснікаў абмеркавалі дагавор па соцыялістычнаму спаборніцтву БССР з Чэрнігаўскай і Кіеўскай абласцямі. Тады на сходае мы ўзялі на сябе абавязацельства дабіцца ў 1936 годзе ўраджайнасці жыта не менш 110 пудоў з гектара, пшаніцы — 100 пудоў, ячменю і аўса — па 200 пудоў і бульбы не менш як 1.220 пудоў з гектара.

Наш калгас, бясспрэчна, даб'ецца намечанай лічбы па ўраджайнасці з перавыкананнем. Для гэтага ў нас ёсць усе ўмовы.

Уся плошча для яравых у нас забяспечана ўгнаеннем. Вывезлі 2.200 вазоў гною і 480 тон ілу з сажалак, завезлі 18 тон фасфарытнай мукі і 9 тон сільвініту. Апрача гэтага атрымліваем 5 тон селітры. Усё насенне адсартавана і праверана на ўсхожасць. Будзем сеяць 10 гектараў аўса яравізаваным насеннем і 5 гектараў ячменю. Праводзім зараз яравізацыю і пратручванне насення.

Увесь пасеў яравых мы будзем праводзіць выключна радковымі сеялкамі. Сёлета мы выходзім у поле з добра адрамантаванымі плугамі і боранамі.

Тады-ж, поўмесяца таму назад, як мы звярнуліся з пісьмом да ўсіх калгаснікаў БССР аб уключэнні ў спаборніцтва за сталінскі ўраджай, у нас у калгасе шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва. Першая брыгада (брыгадзір **Кавальчук Язэп**) спаборнічае з трэцяй брыгадай (брыгадзір **Міхалоўскі Пётр**). Другая брыгада (брыгадзір **Сяліцкі Бранислаў**) таксама ўступіла ў спаборніцтва з першай брыгадай. Кожная брыгада настойліва змагаецца заваяваць пяршынства ў соцыялістычным спаборніцтве.

У выніку соцыялістычнага спаборніцтва ў нас у калгасе выявіліся новыя ўдарнікі.

Ва ўсёй нашай рабоце ў калгасе, асабліва па разгортванню соцспаборніцтва, вельмі многа дапамагае насценная газета «Ўдарнік», якая выдаецца рэгулярна чатыры разы ў месяц. У насценгазеце мы заўсёды адзначаем сваіх перадавікоў і праз насценную газету падцягваем адстаючых.

У часе веснавой сяўбы ў кожнай брыгадзе ў нас будуць выпускацца брыгадныя штодзённікі.

Праводзім баранаванне азімых і канюшыны, бараную зяблівa. Зернавыя мы мяркуем пасеяць не больш, як за 8 дзён.

Я разам са сваімі калгаснікамі прыму ўсе меры да таго, каб атрымаць у гэтым годзе намечаны ўраджай. Я апраўдаю высокую ўзнагароду — ордэн Чырвонага працоўнага сцяга, які я атрымаў ад нашага ўрада.

Ордэнаносец—старшыня калгаса «Чырвоны партызан», Менскага раёна С. Б. БЕЙНЕ.

ПАД ЗНАКАМ СПАБОРНІЦТВА

Соўгас імя Калініна ў поўнай гатоўнасці прыступіў да палявых работ. Усе сілы пераключылі на падрыхтоўку глебы пад яравыя культуры.

8 першых дзён шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва на высокую якасць апрацоўкі глебы. Тут мы скарыстоўваем самую найвышэйшую агратэхніку. Да трактара, які працуе на дыскаванні зяблівa, апрача дыскаў прычэпілі бораны «зігзаг». Зяблівa, як вядома, трэба баранаваць добра, каб не так хутка высыхала вільгань, патрэбная для расліны.

Трактарысты ў спаборніцтве за якасць работы далі добрыя паказчыкі. Зяблівa забаранавана без агрэхаў, у некалькі слядоў. Трактарыст **Павел Леўчанка** на баранаванні даў у змену 10 гектараў пры норме 8 гектараў.

У брыгадзе Палякоўскага Васіля спаборніцтва пачалося з аратых Барсука Васіля і Сафронава Грыгорыя. Яны заключылі паміж сабою дагавор на ўвесь час палявых работ і свае абавязацельствы штодзённа выконваюць. Кожны ўзорвае ў дзень на пары коней па 1 гектару замест нормы ў 0,80 гектара. Следам за імі пачалі спаборніцтва астатнія рабочыя брыгады Палякоўскага. На палях уведзена індывідуальная здзельшчына. Арганізован штодзённы ўлік працы.

Насценгазета паказвае ход спаборніцтва паміж брыгадамі. Кожны дзень арганізавалі праверку выканання абавязацельстваў, узятых брыгадамі па ўздыму ўраджайнасці.

Сяўбу будзем праводзіць на добра апрацаванай і ўгноенай глебе. Насенне гатунковае. Пасеем выключна радковай сеялкай. Кожная сеялка, а іх у соўгасе дзве, павінна пасеяць па 52 гектары.

Вялікую дапамогу нашаму соўгасу аказвае Беларуская акадэмія навук. Акадэмік **Афанасьеў**, прафесары **Пратасеня** і **Дарожкін** распрацавалі рад агратэхнічных правіл па апрацоўцы глебы, угнаенню і сяўбе яравых.

14 красавіка ўсе рабочыя соўгаса падпісалі дагавор па спаборніцтву БССР з Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі. Рабочы калектыў яшчэ раз заявіў, што ў спаборніцтве з соўгасам **«Анопаль»** пяршынства застанецца за намі.

Сёлета мы цвёрда ўпэўнены, што з кожнага гектара будзе 30 цэнтнераў ячменю, 25 цэнтнераў аўса, 17 цэнтнераў жыта і пшаніцы, а з 10 гектараў аўса і 5 гектараў ячменю — па 250 пудоў.

Ордэнаносец ГАРБУЗ В. П., дырэктар соўгаса імя Калініна, Менскага раёна.

Праф. Н. А. ДАРОЖКІН

ЯК ДАБІЦЦА 3000 ПУДОЎ БУЛЬБЫ З ГЕКТАРА

Многія калгасы БССР у адказ на заклік правадыра народаў таварыша Сталіна аб павышэнні ўраджайнасці па прыкладу калгаснікаў Барысаўшчыны ўзялі на сябе абавязацельства атрымаць у 1936 годзе 3.000 пудоў бульбы з гектара.

Справа гэта хоць і складаная, але зусім рэальная.

Першай умовай для атрымання рэкордных ураджаяў з'яўляецца добрая апрацоўка глебы.

У выпадку сухой вясны на лёгкіх супясчаных глебах дастаткова аднаго пераворвання зяблівa на 14—16 см. У час пераворвання запраўляецца гной і іншыя арганічныя ўгнаенні.

На сугліністы і шэрых лясных глебах у выпадку дастатковай колькасці ападкаў неабходна двухразовае вясновае пераворванне зяблівa.

Пры першым заворванні запраўляецца гной, а пры другім — мінеральныя ўгнаенні. Другое пераворванне павінна праводзіцца на 3—5 см. мяльчэй, чым першае, каб не вывернуць наверх заораны спачатку гной.

Пасля кожнага вясновага пераворвання неабходна поле баранаваць у адзін або некалькі слядоў, у залежнасці ад глебы.

Якое насенне трэба садзіць? Гатунак бульбы трэба ўзяць такі, які ў гаспадарцы з'яўляецца найбольш ураджайным, з рэкамендуемых для БССР.

У якасці пасадачнага матэрыялу трэба браць бульбу, убраную ў папярэднія гады ў нармальных умовах, даўшую ў выніку зімовага захоўвання не больш 10 проц. адыходу і не прарослую. Перад пасадкай бульба павінна быць самым дакладным чынам адсартавана ад хворых, уродлівых клубняў. Для атрымання рэкордных ураджаяў ва ўсіх выпадках абавязкова пасадка цэльнымі клубнямі, а не рэзанымі. Пасадачны матэрыял павінен складацца з клубняў вагой ад 50 да 70 гр. Для паскарэння паспявання бульбы, асабліва на цяжкіх глебах, мэтазгодна яравізацыя (папярэдняе прарашчэнне) пасадачнага матэрыялу, асабліва позніх гатункаў.

Апрача гэтага, патрэбна пакласці бульбу на яравізацыю, для пасадкі на выпадак няўсходу клубняў.

Гной павінен унасіцца пад бульбу ў размеры 40—60 тон на 1 гектар. Там, дзе бульба высаджваецца па лубіну, можна абмежавацца 25 тонамі гною. Усюды можна рэкамендаваць дадатковае ўнясенне мінеральнага ўгнаення. Апошняе ўносіцца ў наступных колькасцях: сернакіслы амоній ад 2,25 да 4,5 цэнтнера на 1 гектар, аміячная селітра — 1,5 да 2,5 цэнтнера, суперфасфат — ад 4 да 6 цэнтнераў, калійная соль — ад 3 да 5 цэнтнераў, сільвініт — ад 4 да 8 і попел — ад 10 да 15 цэнтнераў на гектар.

У тым выпадку, калі калгас не мае азоцістых мінеральных угнаенняў, доза гною можа быць павялічана да 50—70 тон на адзін гектар. Сумеснае прымяненне гною з мінеральным угнаеннем заўсёды лепш, чым унясенне аднаго гною, хаця-б і ў больш высокіх дозах.

На лёгкіх глебах больш мэтазгодна ўносіць азоцістыя мінеральныя ўгнаенні ў два прыёмы: поўдозы ў перыяд перадпасеўнай апрацоўкі і другую палову — пры баранаванні ўсходаў. У такім выпадку ўгнаенне неабходна рассеяць па абсохлых пасля расы ці дажджу ўсходах, каб уніхнуць ажогаў на раслінах.

На цяжкіх глебах, каб не затрымліваць паспявання бульбы, мінеральнае азоцістае ўгнаенне ўносіцца адразу ва ўстаноўленай дозе і задаволяецца разам з фасфарытна-калійнымі тукамі плугам пры паўторным пераворванні зяблівa.

Для правільнага размеркавання ўгнаення ў кожным выпадку патрэбна зрабіць аналіз глебы.

Пасадка бульбы. Лепшы час для пасадкі наступае тады, калі ў глебе тэмпература падымаецца да 8 градусаў на глыбіні ў 10 см. У БССР гэты час амаль заўсёды бывае ў канцы красавіка і ў першых чыслах мая. Запаўчасная і занадта позняя пасадка аднолькава шкодны, таму асабліва важна скараціць самы перыяд пасадкі.

На лёгкіх глебах неабходна праводзіць такую пасадку, пасля якой поле набывае гладкую паверхню. Гэта дасягаецца пры пасадцы клубняў пад плуг, абавязковай укладкай клубняў у бок баразны (на правы адкос). На звязных глебах і ў мясцах з пяніжаным рэльефам праводзіцца грэбяністая пасадка. Пры машыннай пасадцы па лёгкіх глебах трэба дыскі ўстанавіць, каб яны ўтваралі нізкія грэбні.

Адлегласць паміж барознамі на лёгкіх глебах 65—70 і на цяжкіх — 70 сантыметраў. Адлегласць у радку паміж клубнямі на больш урадлівых глебах 40—45, а на менш урадлівых 35—40 сантыметраў.

Глыбіня пасадкі на лёгкіх глебах павінна быць 8—10 см., а на больш цяжкіх і сырых не больш 6—8.

Догляд бульбы. Усходы бульбы неабходна абавязкова баранаваць. Пры баранаванні бульбы, пасаджанай у грэбні, лепш ужываць каротказубыя лёгкія бароны, каб не выцягнуць наверх клубні. Пры халоднай вясне, выклікаючай запяжку з'яўлення ўсходаў, неабходна двухразовае баранаванне: першае праз 10—15 дзён пасля пасадкі, а другое — у пачатку з'яўлення ўсходаў.

Пасля з'яўлення ўсходаў павінен быць праведзен агляд поля. У выпадку выяўлення на полі неўзышоўшых клубняў павінна быць зроблена пасадка спачатку прарошчанымі запаснымі клубнямі.

Дзён праз 10—15 пасля з'яўлення ўсходаў міжраддзі трэба пухліць конным планетам з абавязковым адначасовым пухленнем паміж кустамі ў радках ручнымі матыкамі або палопікамі. Міжрадная апрацоўка поля і ручная апрацоўка ў радках на працягу лета паўтараецца 3—4 разы, у залежнасці ад засмечанасці ўчастка, прайшоўшых дажджоў і глебы. На лёгкіх глебах дастаткова аднаго акучвання, перад пачаткам цвіцення. На звязных глебах абавязкова двухразовае акучванне.

Пасля кожнай міжраднай апрацоўкі поля абавязкова дакладная апрацоўка кустоў.

У выпадку з'яўлення на раслінах фітафторы неабходна двухразовае апылкаванне або апырсканне бульбы прэпаратам «АБ» або бардоскай вадкасцю. Скопванне моцна заражонага бульбоўніка, як меру барацьбы з загніваннем бульбы, трэба рабіць не раней чым за 5—10 дзён да ўборкі, у залежнасці ад ступені паражэння і становішча надвор'я.

Вось тыя асноўныя правілы агратэхнікі, прымяненне якіх дазволіць атрымаць 3.000 пудоў бульбы з гектара.

Атрыманне высокіх ураджаяў, а тым больш рэкордных, магчыма толькі пры прымяненні ўсяго комплексу агратэхнічных мерапрыемстваў, пачынаючы з палепшанай апрацоўкі глебы і канчаючы добрым доглядам і ўборкай без страт.

АГЛЯД ДРУКУ

КОПІЯ МІНУЛАГОДНЯГА КАМПЛЕКТА

Рэдакцыя мсціслаўскай раённай газеты не скупіцца на рэзкую ацэнку становішча з падрыхтоўкай да сяўбы ў асобных калгасах раёна. Поласы «Большэвіка Мсціслаўшчыны» поўныя такіх загалоўкаў, як «Ганебныя арывы», «Бяздзейнасць у падрыхтоўцы да сяўбы», «Шкодніцтва і самацёк» і т. д. і т. д.

З нумара ў нумар газета перапявае адно:

«ВЯСЕННЯ-ПАСЕЎНАЯ КАМПАНІЯ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВА.

Надзвычай кепскае становішча з падрыхтоўкай к вясне 1936 года ў калгасе «Першае мая», Мазалаўскага сельсовета. Увесь інвентар, бароны, плугі і калёсы зусім не адрамантаваны».

Варта было ў такой заметцы змяніць назву калгаса, як яна ўжо з поспехам увайшла ў якасці «арыгінальнай» карэспандэнцыі ў чарговы нумар.

«ДА РАМОНТУ ІНВЕНТАРА НЕ ПРЫСТУПІЛІ.

Надзвычай кепскае становішча з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ў калгасе «Ударнік», Доўгавіцкага сельсовета. Да рамонту інвентара зусім не прыступілі».

Вышэй гэтых дробных фіксатарскіх заметак газета не ўзнімаецца. Рэдакцыя «Большэвіка Мсціслаўшчыны» не зразумела асаблівасцей веснавой сяўбы 1936 стаханаўскага года. Старонкі мсціслаўскай газеты за 1936 год нічым не адрозніваюцца ад старонак гэтай газеты за 1935 год. Нібы не было сустрэч кіраўнікоў партыі і ўрада з перадавікамі соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, нібы не было гістарычнай прамовы таварыша **Сталіна** на прыёме перадавых трактарыстаў і камбайнераў.

Ніякай ініцыятывы, ні адной новай думкі аб барацьбе калгаснікаў-ударнікаў за высокі ўраджай 1936 года, за 7—8 мільярдаў пудоў хлеба няма ў газеце. Заметкамі аб засыпцы насенных фондаў і рамонце плугоў, напісанымі па аднаму ўзору і трафарэту, газета абмежавала ўвесь складаны комплекс работ па ўздыму ўраджайнасці.

І тое, што раён не выканаў плана вывазкі гною і торфу, і тое, што ў раёне сарвана падрыхтоўка радкаў сельскай гаспадаркі нікольні не турбуе газету. Яна маўчыць і аб вапнаванні глебы і аб вывазцы вапны на палі, у той час, як у раёне амаль ва ўсіх сельсоветах ёсць дзесяткі тысяч кубаметраў высокагатункавых вапнавых туфаў.

Не бачаць работнікі раённай газеты і таго, што ў Мсціслаўлі на рынках гінуць сотні тон гною, а прыгарадныя калгасы не выканалі плана вывазкі гною ў поле. Маўчыць газета аб зборы попелу, птушынага памёту — аб гэтых рэзервах каштоўнейшага ўгнаення.

Калі-б чытачы «Большэвіка Мсціслаўшчыны» не чыталі іншых газет, яны бадай і па сёнешні дзень не ведалі-б аб магутным разгортванні стаханаўскага руху не толькі ў прамысловасці, але і ў сельскай гаспадарцы. Слова стаханавец трудна знайсці на старонках «Большэвіка Мсціслаўшчыны».

Цікавая акалічнасць. У першых лічбах сакавіка па ініцыятыве райкома партыі ў Хлыпчоўскім сельсавеце былі праведзены курсы стаханаўцаў сельскай гаспадаркі. Патрэбна было больш дзкады і некалькі напамінкаў рэдактару, каб матэрыял аб гэтых курсах урэшце з'явіўся на старонках раённай газеты. Рэдактар газеты тав. **Іваноў** даў па гэтаму пытанню простае тлумачэнне: «Што-ж зрабіць, калі работнік райкома не напісаў».

Разгортваецца спаборніцтва трактарыстаў за 1.000 гектараў на трактар. Калгасы, калгасныя брыгады і звенні спаборнічаюць паміж сабою, змагаюцца за высокі ўраджай, а ў мсціслаўскай газеце аб гэтым спаборніцтве нічога не знойдзеце, як не знойдзеце і паказу лепшых людзей калгаснай вёскі, вопыту іх работы. Сказваецца няўменне рэдакцыі ісці ў нагу з жыццём, працаваць метадамі стаханаўскага года, дапамагаць калгасам шляхам папулярызацыі лепшых узораў барацьбы за высокі ўраджай, за агратэхніку. Не зразумеўшы ўсіх тых вірухаў, што адбыліся ў сельскай гаспадарцы ў гэтым годзе, газета міжвольна апынулася ў ролі рэгістратара паведамленняў аб тым, што тут рамонтуюць інвентар, а там не рамонтуюць, тут ачысцілі насенне, а там не ачысцілі і т. д.

«Паўтараецца мінулагодняя практыка» — так пісала мсціслаўская раённая газета год таму назад пра калгас «Чырвоная зорка». На жаль, гэта «мінулагодняя практыка» паўтараецца не толькі ў рабоце адстаючых калгасаў, яна сказваецца і ў сістэме работы газеты Мсціслаўскага раёна.

Культурна-масавая работа ў полі

Наш калгас «Новы шлях», Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета, з'яўляецца адным з буйнейшых калгасаў Менскага раёна. Калгас аб'яднае 200 гаспадарак, мае 8 паляводчых брыгад. А партыйна-комсамольскія сілы ў нас невялікія, усяго толькі 4 комуністы і 11 комсамольцаў.

Як мы гэтымі сіламі арганізоўваем партыйна-масавую работу ў часе веснавой сяўбы?

Перш за ўсё мы арганізуем гучную чытку газет у брыгадах і звеннях на полі ў часе перапынкаў. Ужо вылучаны чытчыкі, якімі з'яўляюцца ўсе комуністы, комсамольцы і больш палітычна пісьменныя калгаснікі-актывісты. Усяго вылучана 18 чытчыкаў.

Газетамі наш калгас забяспечан. Выпісваецца розных газет — «Правды», «Звязды», «Комсомольской правды» і «Чырвонай змены» — 127 экземпляраў.

Вялікую ролю адыгрываюць на сяўбе брыгадныя штодзённікі. Гэта паказаў вопыт мінулага года. У гэтым годзе ў нас таксама будзе выходзіць у кожнай брыгадзе штодзённік. Ужо вылучаны адказныя за выпуск іх.

У брыгадных штодзённках мы будзем паказваць нашых лепшых ударнікаў, якія сапраўды па-большэвіцку змагаюцца за высокую якасць работы, за сталінскі ўраджай. Адначасова будзем праз гэтую-ж насценгазету падцягваць адстаючых.

У нас у калгасе ёсць нядрэнная бібліятэка, якая налічвае звыш 1.500 розных кніг. Для таго, каб наблізіць кнігу да калгасніка, мы ў кожнай брыгадзе арганізавалі бібліятэчку-перасоўку. Спецыяльна вылучаныя таварышы бяруць з калгаснай бібліятэкі пэўную колькасць кніг, даюць іх жадаючым чытаць у брыгадах, а потым, калі кнігі прачытваюцца, а бібліятэкі бяруцца новыя. Такі метад наблізжэння кнігі да калгасніка даў станоўчыя вынікі.

На час сяўбы мы камплектуем брыгадныя бібліятэчкі-перасоўкі ў большасці з кніг па пытаннях агратэхнікі і арганізацыі працы ў брыгадзе.

Пытанне аб правядзенні культурна-масавай работы ў полі мы прапрацавалі на спецыяльнай нарадзе комуністаў і комсамольцаў разам з вылучанымі чытчыкамі газет. Намечан план работы, кожны з прысутных на нарадзе атрымаў канкрэтнае заданне. Праверку выканання намечанага плана кожным у паасобку комуністам і комсамольцам я праводжу сам. Апрача гэтага ўвечары пасля работы будзем практыкаваць кароткія нарады чытчыкаў газет для абмену вопытам іх работы.

Немалую работу мы правялі ў сваім калгасе па разгортванню соцыялістычнага спаборніцтва. На агульным сходзе калгаснікаў абмеркавалі заключаны БССР соцыялістычны дагавор з Кіеўскай і Чэрнігаўскай абласцямі. Тут-жа ўсе нашы брыгады ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па павышэнню ўраджайнасці і заключылі паміж сабою дагаворы на спаборніцтва. Праведзена нарада лепшых ударнікаў — перадавікоў ураджайнасці.

Я ўпэўнен, што наш калгас у спаборніцтве з калгасам імя Сталіна, Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета, заваюе соцыялістычнае пяршынства, заваюе права быць у перадавой калоне на першамайскай дэманстрацыі ў Менску. За гэта ў нас змагаецца кожны калгаснік і калгасніца.

Шырока разгорнутай партыйна-масавай работай у полі мы забяспечым поспех веснавой сяўбы, поспех барацьбы за высокі ўраджай.

А. ВАРАБ'ЁЎ. Парторг калгаса «Новы шлях», Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавета, Менскага раёна.

У звяне Мурашкі Дуні

ЛЁЗНА. У калгасах Лёзняншчыны арганізавана больш 20 звеньняў, якія паставілі сваёй задачай заняць з гектара 10 цэнтнераў валакна. Пад лён адведзены лепшыя ўчасткі. Праведзена вялікая работа па збору ўгнаення, па адбору і ачыстцы ільнонасення.

Звяно Мурашкі Дуні з калгаса імя Калініна пры дапамозе агранома распрацавала дэтальны агратэхнічны план. Будзе высяваецца селекцыйнае насенне 100-проц. ўсхожасці. Норма высеву на гектар 150—160 кілограмаў. Сяўба будзе праводзіцца ільняной радковай сеялкай. Лён будзе падкормліваецца азоцістымі ўгнаеннямі з разліку 45—60 кілограмаў на гектар. Каб папярэдзіць лён ад вылягання, звяно намеціла ставіць сеткі 30 сантыметраў вышынёй. Падрыхтоўваюцца колікі, жэрдкі і шпагат.

Вайна ў Абісініі

РЫМ, 15 красавіка. (БЕЛТА). Афіцыяльна паведамляецца, што сёння італьянскія войскі ўвайшлі ў Дэсіе.

***

ЛОНДАН, 15 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе карэспандэнт Рэйтэр у Асмары (Эрытрэя), італьянцы назвалі самы вышэйшы пункт поўвострава Гор-Гора на возеры Тана «пікам Мусаліні». Паводле слоў карэспандэнта, гэтаму жэсту надаюць палітычнае значэнне, бо ён сведчыць аб жаданні італьянцаў падкрэсліць свой намер захаваць у сваіх руках раён возера Тана.

«МІРНЫЯ» ПРАПАНОВЫ ІТАЛІІ

ЛОНДАН, 16 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе парыжскі карэспандэнт «Ньюс кронікл», італьянскі пасол паведаміў французскаму ўраду, што Італія ставіць умовай пачатку мірных перагавораў поўнае разбраенне Абісініі. Пасол заявіў таксама, што Італія патрабуе адмены санкцый і настойвае на непасрэдных перагаворах паміж Рымам і Адыс-Абебай. Мусаліні, як паведамляюць, заявіў, што ў аснову мірных перагавораў павінна быць пакладзена пагадненне паміж Англіяй і Італіяй ад 1925 года па пытанню аб Абісініі.

АНГЛІЙСКАЯ ПАЗЫКА ГЕРМАНІІ

ЛОНДАН, 15 красавіка. Газета «Дэйлі экспрэс» сцвярджае, што англійскі ўрад абмяркоўвае пытанне аб прадастаўленні Германіі пазыкі ў 10 ці 20 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (фунт стэрлінгаў — 25 руб.) Мэта пазыкі — «набыццё сыравінных матэрыялаў».

Газета ўказвае, што ва ўмовы пазыкі, магчыма, будзе ўключана агаворка аб тым, што закупленая сыравіна не павінна ісці на ўзбраенні. Аднак тут-жа газета сама прызнае, што па думцы спецыялістаў, цяжка правесці розніцу паміж сыравінай, якая ідзе на ўзбраенне, і іншай сыравінай. Таму, указвае газета, падобная агаворка будзе пазбаўлена сэнсу, і пазыка па сутнасці будзе спрыяць росту германскіх узбраенняў.

Газета «Дэйлі экспрэс», пярэчачы супроць пазыкі, прыводзіць некаторыя даныя аб германскай запазычанасці Англіі. Гэта запазычанасць, апрача неаплочаных крэдытаў, складае 92 мільёны фунтаў стэрлінгаў.

НА АБАРОНУ ТЭЛЬМАНА

ЛОНДАН, 15 красавіка. (БЕЛТА). Дэпутаты парламента — лейбарыст Дэвіс і лейбарыстка Сміс адправіліся ў Берлін. Яны намераны дабіцца ад германскага ўрада адказу на патрабаванне 108 дэпутатаў парламента — **разгледзець у самым тэрміновым парадку абвінавачанне, высоўваемае супроць Тэльмана, ці неадкладна яго вызваліць.**

ЗАЯВА ФРАНЦУЗСКАГА ПРЭМ'ЕРА САРРО

ПАРЫЖ, 16 красавіка. (БЕЛТА). Французскі прэм'ер Сарро выступіў учора на банкеце правінцыяльнага друку з прамовай, якая перадавалася ўсімі французскімі дзяржаўнымі радыёстанцыямі. Прамова разглядаецца, як свайго роду ўводзіны да палітычнай дэкларацыі, якая будзе агалошана гэтымі днямі.

«Францыя зразумела, — заявіў Сарро, — што яна перад крызісам, самым страшным за апошнія 20 год. Французскі ўрад жадае міру, але міру, угрунтаванага на бязпасных і дастойнстве.

Французскі ідэал міру імкнецца аб'яднаць супроць магчымага зломыснікa ўсе сілы, якія ахоўваюць мір».

Перайшоўшы да апэнкі ваенных магчымасцей Францыі, Сарро заявіў: «Нашы ўзброеныя сілы, наша армія, наш флот, наша авіяцыя ў поўнай меры адпавядаюць той высокай місіі, якая ім можа быць даручана».

«Трэба, — завяршыў Сарро, — каб тыя, хто будзе весці з намі перагаворы, ведалі, што перад ім будзе партнёр, даволі моцны і рашучы».

ПАЧАТАК ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ У ЗША

НЬЮ-ЮРК, 14 красавіка. Факельным маршам па вуліцах Балціморы пад гукі фанфар адкрылася выбарчая кампанія гэтага года (выбары прэзідэнта павінны адбыцца ў пачатку лістапада). Прэзідэнт Рузвельт у прамове, знаменаваўшай пачатак выбарчай кампаніі дэмакратычнай партыі, заявіў аб неабходнасці павелічэння зарплаты, забароне наёмнай працы для асоб маладзей 18 і старэй 65 год, а таксама ўвядзення закону аб мінімальнай заработнай плаце і дапамозе беспрацоўным.

Пісьмы з заводаў і фабрык

НЕ КЛАПОЦЯЦЦА АБ СТАХАНАЎЦАХ

Я працую на швэйнай фабрыцы «Кастрычнік» у якасці закройшчыка. Спачатку працаваў ручным спосабам — праводзіў абмелку лагаў і ножніцамі скройваў кожную лагу паасобна, а з часу разгортвання стахانаўскага руху змяніў метады работы. Абмелку пачаў рабіць не на кожным лагу паасобна, а толькі на чатырох, усе-ж астатнія падкладваў пад іх. Лагі таксама рэзаў не кожную паасобна, а па 12—13 і не ножніцамі, а электразакройнай машынкай. У выніку замест чатырох чалавек на гэтай аперацыі спраўляліся ў двух.

У часе пераходу фабрыкі на пашыўку адзення летняга асартыменту начальнік нашага цэха тав. Столяр забараніў мне працаваць новымі метадамі. Ён прымусіў працаваць зноў ручным спосабам.

Пару месяцаў таму назад я ўнёс рацыяналізатарскую прапанову, у рэзультаце якой на кожным 100 польтаў эканоміцца 5 метраў плюшу. Сам начальнік цэха ўхваліў гэту прапанову, але да гэтага часу прапанова не ажыццяўляецца.

5 лютага я захварэў. Мне патрэбна была даведка, што я стахانавец, бо ў больніцу стахانаўцаў прымалі ў першую чаргу, але начальнік цэха Столяр чамусьці адмовіўся выдаць такую даведку.

Зараз па заключэнню туберкулёзнага дыспансера, мне неабходна паехаць на курорт. Зварачаўся я па гэтаму пытанню ў фабком. Але старшыня фабкома Левін аднёсся да мяне фармальна. Ён заявіў, што такіх, як я, у яго многа.

М. ЛІУШЫЦ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«ДЗІЎНАЕ МАЎЧАННЕ НАРКАМЗЕМА»

Факты, указаныя ў пісьме агранома з Чырвонапольскага раёна тав. Дабужскага — «Дзіўнае маўчанне Наркамзема» («Звязда» ад 27 сакавіка г. г.), пацвердзіліся.

Начальнік бульбяна-гароднягa кіраўніцтва НКЗБ паведаміў, што работнікі касцюковіцкай базы «Заготзярна» за затрыманне абмену гатунковага насення калгасам прыцягнуты да адказнасці. Прыняты меры па забеспячэнню выканання плана абмену гатунковага насення.

ПРЭМІІ ЗА ЛЕПШЫЯ НАВУКОВЫЯ РАБОТЫ

У мінулым годзе прэзідыум Беларускай Акадэміі Навук абвясціў конкурс на лепшую навукова-даследчую работу. З напісаных 147 навуковых работ на конкурс падана 16 найбольш каштоўных. Прэзідыум Акадэміі разгледзеў прапановы конкурснай камісіі па папярэдніх выніках конкурсу. Выданы прэміі за 5 навуковых работ. Сярод іх работа праф. Дарожкіна — «Вынікі сямігадовага вывучэння парошыстай паршы бульбы ў БССР», праф. Ламцёва — Беларуская граматыка», вучонага сакратара Інстытута гісторыі Лебовіча — «133 дні Венгерскай комуны» і інш.

Для правядзення такога-ж конкурсу сёлета прэзідыум Беларускай Акадэміі Навук вылучыў камісію ў складзе акадэмікаў Шчарбакова, Бурстына, Матулайціса, Коласа, Вальфсона, Афанасьева і праф. Шпенцэра. (БЕЛТА).

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАНЦОРАЎ-БУДАЎНІКОЎ У ТЭАТРЫ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Гурток танцаў пры менскім клубе будаўнікоў атрымаў запрашэнне на выступленне ў Маскоўскім тэатры народнай творчасці з 28 красавіка па 5 мая. Гурток — адзін з лепшых самадзейных танцавальных гурткоў БССР. Ён заняў першае месца на ўсебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці і выступаў на ўсесаюзным праглядзе самадзейнага мастацтва ў ВЦСПС. Для выступлення ў тэатры народнай творчасці адабраны 24 чал. Яны выканаюць беларускія народныя танцы — «Лявоніху», «Юрэчку» і інш. Разам з імі выязджае музычны ансамбль народных інструментаў.

АГІТПАВОЗКА НА ПАЛЯХ

Смілавіцкі райком ЛКСМБ і раённы зямельны аддзел арганізавалі агітпавозку для культурнага абслугоўвання калгасаў раёна на час палявых работ. Агітпавозка мае кінеперасоўку, бібліятэку, баян і патэфон з пласцінкамі.

В. ГАРБАЧОЎ.

ГНУСНАЕ ЗЛАЧЫНСТВА

3-га красавіка дырэктар дамانаўскай няпоўнай сярэдняй школы, Продвінскага сельсовета, Бабруйскага раёна, Б. М. Рудакоў пакінуў у класе пасля заняткаў чатырох вучняў. Сярод іх была 10-гадовая вучаніца другога класа К. Хутка Рудакоў адпусціў трох вучняў дамоў, а К. пакінуў у школе, дзе прабаваў яе згвалціць. Гнусны злачынца арыштован і прыцягваецца да судовай адказнасці.

Н. В.

ЮНЫЯ НАТУРАЛІСТЫ

Школьнікі піонеры Айзік Ліс і Гога Бондараў, III класа 21-й школы на Цэнтральнай дзіцячай тэхнічнай станцыі зрабілі шпакоўніцу.

Фото С. Грына.

ХУТКА ЛЕТА

У садзе «Профінтэрн» кіпіць работа. Скінуты шэрыя платы, знімаецца рад старых пабудоў. Узамен іх робяць новыя. У паветры пахне свежым дрэвам і масляной фарбай.

Адкрытая эстрада агароджваецца, устаноўлены лавы на 2.000 глядачоў. Гэта будзе «Зялёны тэатр». Да 20 красавіка тэатр будзе гатоў. Для алей зроблены 200 лаў па эскізах Маскоўскага цэнтральнага парка культуры і адпачынку. Лавы прыгожыя, шырокія, зручныя, афарбаваныя светлай масляной фарбай.

На алеях падвешваюцца кранштэйны для электрычных ліхтароў. Прыбыло 350 малочных тароў. Атрыманы 4 антычныя скульптуры і гэтымі днямі прыбудуць 4 сучасныя скульптуры і 65 ваз для кветак. Стаяць афарбаваныя 200 урн. На цэнтральнай алеі ляжаць тры жалезныя фермы з ракцыёна «лятаючыя людзі».

У цэнтры саду 17 красавіка пачынаюць будаваць фантан. Пабудавана камера хавання веламашын. Апрача гэтага ў садзе будзе веларамонтная майстэрня. Зняцце асобных пабудоў адкрыла від на прыгожую жывапісную горку з гаем. Там пабудавана бяседка на выпадак дажджу. Для дзяцей робяць качалкі, паўзушкі і т. д. У гэтым месяцы сад атрымае 50 шлюпак для лодачнай станцыі.

Арганізавана ўласная аранжарэя, закладзена з дзесятак рам. Усяго будзе закладзена 60 рам, а на зіму пабудавана цяпліца. Сад і парк культуры і адпачынку будуць мець уласныя кветкі і адкрыюць продаж іх.

Аднак, ёсць рад нявырашаных дагэтуль пытанняў. Каму будзе належаць опартыўны стадыён у садзе «Профінтэрн». Гэта пакуль яшчэ невядома. Бюро фізкультуры ЦСПСБ не жадае перадаць стадыён саду, але і само нічога не робіць.

Два гады Наркомасветы не выкарыстоўвае закрыты летні тэатр. Няўжо і ў гэтым годзе будзе пуставаць памяшканне? Не рыхтуецца да цыркавога сезона «УЦЭМП». Памяшканне цырка, якое знаходзіцца на тэрыторыі саду, не прыводзіцца ў парадак.

У парку культуры і адпачынку будуецца ўваход з касамі. Прыбыў атракцыён «Молат-сіламер». Каля адкрытай эстрады пабудаваны лавы на 800 месц. Будуюць 20 «грыбоў» для хавання ад дажджу.

Аднак, аб'ём работы ў парку значна меншы, чым у садзе. Для парку пабудавана толькі 40 лаў маскоўскага ўзору, у ім будзе менш скульптур і ваз для кветак. Горсовет яўна не разумее, што адзін сад «Профінтэрн» не вырашае праблемы арганізацыі культурнага адпачынку для працоўных сталіцы. У садзе «Профінтэрн» чакаецца леташняя штурханіна, а, бадай, яшчэ большая.

Белдзяржкіно павінна ў парку пабудаваць кінотэатр. Матэрыял завезлі, але будаўніцтва яшчэ не пачалося. Дом навукі і тэхнікі напалову не закончыў будаўніцтва павільёна навукі і тэхнікі і кінуў работу.

Будаўніцтва парку і саду адчувае вострую патрэбу ў матэрыялах, але дапамогі ад горсовета (канкрэтна: старшыні горплана тав. Барана) вельмі мала.

І. ЦЫВЕС.

Коратка

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і БЕЛТА).

* **Сяўбу каўчуканосу кок-сагыз** распачалі калгасы Слуцкага, Пухавіцкага, Глускага і Шклоўскага раёнаў. 60 калгасаў рэспублікі гэтай вясной засеюць 112 гектараў кок-сагыза.

* **Мастацкая брыгада ЦК саюза сплаўшчыкаў** у складзе 12 чалавек прыехала з Масквы ў БССР для абслугоўвання сплаўшчыкаў. 15 красавіка брыгада выехала ў гомельскі сплаўны басейн, дзе будзе даваць пастаноўкі на плывучай культбазе.

* **Інжынеры маскоўскага аўтазавода імя Сталіна** тт. Конэ, Рабіновіч і Месожнікаў 15 красавіка праз Менск праехалі з заграніцы ў Маскву. Яны былі камандзіраваны заводам у Амерыку, дзе знаёміліся з аўтамабільнай прамысловасцю ЗША і закупілі абсталяванне для выпуску сямімясцовых машын маркі «Зіс-101».

* **109 дашкольных работнікаў** выпусцілі аднагадовыя курсы пры менскім педагагічным дашкольным тэхнікуме. Выпускнікі едуць працаваць у раёны ў якасці інспектароў раённых аддзелаў асветы па дашкольнай рабоце, загадчыкаў дзіцячых садоў і кіраўнікоў дашкольных дзіцячых дамоў.

СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

* 13 красавіка ў Тіфлісе пачаліся ўсесаюзныя спаборніцтвы па баскетболу. Мужчынская каманда БССР выйграла сустрэчы з камандамі Новасібірска і Харкава і прайграла камандзе Тіфліса. Жаночая каманда БССР прайграла камандам Свердлоўска, Харкава і Тіфліса.

* У клубе НКУС БССР учора пачаліся спаборніцтвы цяжкаатлётаў таварыства «Дынамо» чатырох гарадоў — Менска, Гомеля, Магілева і Бабруйска. У спаборніцтвах прымаюць удзел 45 штангістаў і барцоў.

ЗДАРЭННІ

* **Злачынцы за рулём.** 15 красавіка ў Менску адбыліся некалькі вулічных аварый. Па Сураж-скай вуліцы аўтамашына № 57-28 Мендабрабыту, кіруемая шофарам П. І. Юроўскім, наскочыла на пераходзіўшага вуліцу рабочага Белводгаса В. І. Мазінскага, які быў задаўлен на смерць. Аўтамашына, кіруемая шофарам Панчанка, наскочыла на сустрэчную грузавую аўтамашыну калгаса «Перамога», Лагойскага раёна, на якой ехалі пасажыры. У выніку аварыі 8 чал. атрымалі раненні. Шоферы Юроўскі і Панчанка арыштаваны і прыцягваюцца да адказнасці.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1

17 красавіка
ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ
Пачатак у 8 г. веч.
Білеты ў касе тэатра

Памяшканне Польскага тэатра (Совецкая, 17 тэл. 25-153)

20, 21, 22 красавіка
гастролі рускага тэатра БДА
А. АФІНАГЕНАЎ.
ДАЛЁКАЕ
Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара.
Білеты ў касе тэатра з 12 да 2 г. дня і з 5 г. вечара.
Калектывам — скідка.
На 23 і 24 чысло білеты ўсе праданы.

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» — Гукавы мастацкі фільм Партыйны білет

Гукавы кінатэатр «ПРОЛЕТАРЫЙ» — Гукавы мастацкі фільм „ДУБРОВСКИЙ"

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» — Гукавы мастацкі фільм „СЛАВА СВЕТУ"

Кіно „СПАРТАК" — Усходні мастацкі фільм ГЮЛІ

НАРКАМХАРЧПРОМ СССР
ТАБАКГАНДАЛЬ
ГЭТЫМІ ДНЯМІ ў Менску па Совецкай вул., д. 62
АДКРЫВАЕЦЦА
ўзорна-паказальны МАГАЗІН табачных вырабаў Табакгандля
У МАГАЗІН ПАСТУПІЛІ І ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ Ў НЕАБМЕЖАВАНАЙ КОЛЬКАСЦІ І ВЯЛІКІМ АСАРТЫМЕНЦЕ:
ПАПЯРОСЫ, ТАБАК розны,
а таксама трубачны вышэйшых гатункаў, згатоўленыя з адборных табакоў Крыма і Каўказа.
У МАГАЗІНЕ ЁСЦЬ ВЯЛІКІ ВЫБАР ТРУБАК, МУНШТУКОЎ, ПАРТСІГАРАЎ І ІНШАЙ ТАБАЧНАЙ ГАЛАНТАРЭІ.
Магазін адкрыт бесперапынна з 8 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы.

19 КРАСАВІКА, у 7 г. вечара, у клубе імя Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Комсамольскай)
АДБУДЗЕЦЦА
ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА Менскага Гарадскога Совета
рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.
У парадку дня — аб выніках справаздачнай кампаніі Горсовета.
Запрашаюцца стахانаўцы прадпрыемстваў.
Білеты можна атрымаць у Горсовеце (пакой 49, III паверх) з 9 да 4 г. дня і з 6 да 9 г. вечара.
ПРЭЗІДЫУМ МЕНГОРСОВЕТА.

УНІВЕРСІТЭТ ДЛЯ СТАХАНАЎЦАЎ
(Комсамольская, 25, Цэнтральны дом тэхнікі)
18 КРАСАВІКА — раніцай і вечарам:
1. ЛЕКЦЫЯ праф. БРАНШТЭЙНА — «Творчасць Уладзіміра Маякоўскага».
2. КАНЦЭРТ.
РЭКТАРАТ.

ЛЕПШЫ АДПАЧЫНАК — ПАДАРОЖЖА ПА СССР.
У МЭТАХ АБМЕНУ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ, АЗНАЯМЛЕННЯ З ДАСЯГНЕННЯМІ Ў СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ І ДАСТАПРЫМЯЧАЛЬНАСЦЯМІ НАШАЙ КРАІНЫ,
АРГАНІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАГА АДПАЧЫНКУ.
БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА ЎСЕСАЮЗНАГА ТАВАРЫСТВА ПРОЛЕТАРСКАГА ТУРЫЗМА І ЭКСКУРСІЙ арганізуе экскурсіі і падарожжы па СССР.
У 1936 г. АДКРЫТЫ НАСТУПНЫЯ МАРШРУТЫ:
КРЫМ, КАЎКАЗ, АЛТАЙ, ВОЛГА | БЕЛ. БАЛТ. КАНАЛ, ЗАПАЛЯР'Е, УКРАІНА, воз. СЕЛІГЕР | МАСКВА, ЛЕНІНГРАД, КУЗБАС, МІЧУРЫНСК
Ёсць маршруты ў Крым і на Каўказ з 10—20—30-дзённым прабываннем на адной базе.
Кожны працоўны можа набыць пуцёўку на любы маршрут у РАСТЭРМІНОЎКУ.
Працягласць пуцёвак ад 5 да 22 дзён.
Кошт пуцёвак ад 102 да 592 руб.
У кошт пуцёўкі ўключана поўнае абслугоўванне: харчаванне, памяшканне, культ і экскурсійныя мерапрыемствы і ўнутрымаршрутны транспарт.
На маршруты Масква—Ленінград на ліпень пуцёўкі ўсе праданы.
Арганізацыі, жадаючыя забяспечыць сябе пуцёўкамі на экскурсіі і падарожжы па СССР, павінны неадкладна заключыць дагаворы.
Заключэнне дагавораў, даведкі і кансультацыі — у Беларускай канторы па запісу Цэнтральнага совета ўсесаюзнага таварыства пролетарскага турызма і экскурсій.
Менск, рог вуліц Карла Маркса і Урыцкага, 11-16, тэл. 21-730.
Запросы пасылаць з зваротным адказам.

Друкарні „ЗВЯЗДЫ" ПАТРЭБНЫ:
ЦЫНКОГРАФ-травільшчык,
ст. БУХГАЛТАР,
ВЯРСТАЛЬШЧЫКІ,
ЧОРНАРАБОЧЫЯ і РАБОТНІКІ АХОВЫ
Зварачацца: Совецкая, 63, 2-гі паверх.

Ушосдору НКУС БССР
ПАТРАБУЮЦЦА
галоўныя бухгалтары, старшыя бухгалтары і бухгалтары
для работы на перыферыі.
Зварачацца: Менск, Дом урада, пакой 639, да галоўнага бухгалтара.

Цэнтральнаму дзіцячаму дыспансеру (вул. Луначарскага, д. 5)
ПАТРЭБНЫ тэрмінова прыбіральшчыцы.
Зварачацца да т. Мееровіча.

У 5 МІНУТ ГАРАЧАЕ БЛЮДА
СВІНО БОБОВЫЕ
СВІНА-БАБОВЫЯ КАНСЕРВЫ
ЭКАНОМНЫЯ, СМАЧНЫЯ І ПРЫЕМНЫЯ НА СМАК,
ПАДАГРЭЙЦЕ ІХ, і ГАТОВА ДРУГОЕ БЛЮДА,
куды ўваходзяць: свіное сала (або мяса), адборная белая фасоль, тамат, цукар, соль, цыбуля, часнок, салодкі перац і воцат.
ЦАНА БАНКІ СВІНА-БАБОВЫХ КАНСЕРВАЎ
у 580 грам з мясам 2 р. 80 кап.,
в салам 2 р. 30 к.
ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ ПРАДУКТОВЫХ МАГАЗІНАХ.

Аб'яднанне „МЕНЛАРОК" Горхарчгандля
даводзіць да ведама усіх дзяржаўных, кааперацыйных арганізацый, а таксама сталовых гор. Менска, што „МЕНЛАРОК"
прымае на сябе забеспячэнне
ДА СВЯТА ПЕРШАГА МАЯ
вечароў, а таксама сямейных вечароў,
ПІВАМ, як у бочках, так і ў бутэльках,
КВАСЫ розных гатункаў,
напіткі — сітро, в шнёвы напітак, морс,
а таксама МАРОЖАНАЕ РОЗНЫХ ГАТУНКАЎ,
рыбакулінарныя вырабы высокай якасці.
Апрача гэтага даводзіцца да ведама, што піваварны завод „Беларусь" ніякіх водпускаў
да 1 мая арганізацыям і сталовым рабіць не будзе.
Заяўкі прымаюцца ў канторы „Менларок" (вул. Энгельса, д. 8. Тэл. 21-305 або 25-199, з 2 да 4 г. дня штодзённа — да 25 красавіка.
Пасля гэтага тэрміну заяўкі прымацца не будуць.
Дырэкцыя аб'яд. „Менгорларок", Дырэкцыя завода „Беларусь"

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 12

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

10 красавіка 1936 г. г. Менск.

АБ ПРОДАЖЫ МАЛАКА І МАЛОЧНЫХ ПРАДУКТАЎ

У мэтах забеспячэння насельніцтва г. Менска добразнасным малаком і малочнымі прадуктамі, Менскі Гарадскі Совет **пастанаўляе:**

1. Продаж малака і малочных прадуктаў дазваляецца на спецыяльна вызначаных месцах: з вазоў і з сталоў не ніжэй $^{3}/_{4}$ метра ад узроўню зямлі.

2. **Забараняецца:**

а) выбіраць для продажу малака і малочных прадуктаў месца ў адлегласці бліжэй 50 метраў ад выграбных і смецяцевых ям, прыбіралень і іншых крыніц забруджання;

б) трымаць каля месц продажу малака і малочных прадуктаў тавары з розным непрыемным пахам (газы, дзёгця, рыззя, скур і інш.).

3. Прадаўцы малака абавязаны насіць чыстую спецвопратку (халат або пярэднік з нагрудникам і нарукаўнікамі, касынку) і ўтрымліваць у чыстаце рукі.

Продаж малака ад хворай жывёлы забараняецца.

4. Абавязаць Менскую дзяржаўную санітарную інспекцыю рабіць лабараторны выбарачны кантроль прадаваемага на рынках малака.

Малако, прызнанае нядобраякасным, падлягае канфіскацыі.

5. Пасуда, з якой прадаецца малако і малочныя прадукты, павінна быць чыстай і зроблена не з шкоднага для здароўя матэрыялу (лужаныя бідоны, шклянная пасуда). Крышкі павінны быць шчыльныя. Ужыванне пробкі з анучы, паперы і т. д. забараняецца.

6. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу ў суме да 100 руб. або прымусовым работам да 14 дзён.

7. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на міліцыю і санітарную інспекцыю.

Старшыня Менскага Горсовета Е. ЖУКОВІЧ.
Сакратар Менскага Горсовета І. КАЗЛОЎСКІ.

У аддзел аб'яў звяніце па тэлефону № 21-845

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 68. Уп. Галоўлітбела № Г—4729.